

**Каму на Прыпяці рыбу лавіць?**

СТАР. 3



**Ці бываюць фінансісты ў акопах?**

СТАР. 5



**Кароль згуляў вяселле ў Гальшанах**

СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 МАЯ 2017 г. АЎТОРАК №95 (28459)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Кулікова «заручыны»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Адзіная станцыя па кальцаванні птушак у нашай краіне знаходзіцца ў Тураве. Яна адкрыта ў 1999 годзе і спецыялізуецца на куліках, якія ў час міграцыі прыпыняюцца ў пойме Прыпяці. З пачатку вясны і да сярэдзіны лета на ёй «акальцоўваюць» птушак і вядуць іх улік. Гэтым займаюцца не толькі прафесійныя арнітолагі, але і валанцёры — аматары назірання за крылатымі.

СТАР. 10

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:**

*«Сёння Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусі здольныя эфектыўна рэагаваць на сучасныя выклікі і пагрозы. Павышэнне іх баявой магутнасці мы бачым у тым ліку ў паляпшэнні якасных характарыстык узораў ваеннай тэхнікі, якія стаяць на ўзбраенні. Гэты працэс ажыццяўляецца па некалькіх напрамках. Па-першае, закупка новага ўзбраення і ваеннай тэхнікі, якія адпавядаюць самым сучасным сусветным стандартам. Па-другое, распрацоўка і аснашчэнне Узброеных Сіл айчыннымі комплексамі і сістэмамі. Прыняцце на ўзбраенне новых узораў і сістэм з'яўляецца пакказчыкам інавацыйнай думкі і паспяховай дзейнасці кампаній, якія стварылі яго».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8525 | ▼ |
| Еўра | 2,0713 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0703 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Адкрываючы Беларусь

## АД ЛЯСНОЙ — ДА НЯМНОВА

### Упершыню новы веламаршрут злучыць абодва бакі Аўгустоўскага канала

**Наш карэспандэнт праехала паўсотні кіламетраў па лясных сцежках і даведалася, што цікавага чакае тут турыстаў. А таксама якія недарэчнасці могуць іх сустрэць на маляўнічых берагах, дзе некалі жылі плямёны яцвягаў.**




### Да самай мяжы

На веласіпедзе гэтым маршрутам не паедзеш, бо ён яшчэ ў распрацоўцы. Але ўжо мае нумар — 433 — і назву — «Яцвяжскі». Яцвягамі звалі племя балтаў, якія ў старажытнасці насялялі міжрэчча Нарава і Нёмана.

Калясіць гэтымі сцежкамі можна будзе пасля таго, як завершыцца маркіроўка, будуць устаноўлены знакі і карты. Каб вызначыць гэтыя месцы, на канал адправілася невялічкая экспедыцыя, у склад якой увайшла і карэспандэнт «Звязды». Нам трэба будзе праехаць усе 50 кіламетраў будучага маршруту, які пакуль існуе толькі на карце. Яго неабходна пазначыць на мясцовасці. Вось тады велатурыст зможа па стрэлках і нумарах на ім праехаць. А пакуль гэтым шляхам мы рушым на «бусе» з прадстаўнікамі турысцка-спартыўнага саюза.

СТАР. 5

## ІНТЭРНЭТ І ДЗЕЦІ: ХТО КІМ ВАЛОДАЕ?

**Расстройства паводзінаў, адаптацыі, праблемы з харчаваннем або сном — не такая ўжо і рэдкасць для сучасных дзяцей і падлеткаў. І займаецца імі адразу некалькі спецыялістаў: псіхолаг, псіхатэрапеўт, псіхіятр, калі трэба, то і лагапед. Спецыялісты кажуць, што новы час заўсёды падкідвае новыя выклікі. Здаецца, усе ўжо адчуваюць пэўнае размыванне меж паміж дарослымі і дзецьмі, паміж паламі, нейкімі сацыяльнымі групамі. Раней усё ж такі чорнае было чорным, а цяпер магчымы і «варыянты». Таму, з аднаго боку, трэба вучыцца адаптавацца, асвойваць новы свет, а з другога — мець на ўвазе, што фізіялогія наша не змянілася, што наш мозг не займеў пакуль магчымасцяў засвойваць той аб'ём інфармацыі, які абрынуўся на нас з інтэрнэту, значыць, сёе-тое са «старых ісцін» яшчэ можа спатрэбіцца.**

СТАР. 4



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# АД РАЗНЯВОЛЕННЯ БІЗНЕС-ІНІЦЫЯТЫВЫ ДА ІДЭАЛОГІІ ПРАЗ СПОРТ

**Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка правёў шэраг рабочых сустрэч. Ключавымі тэмы: аптымізацыя і задачы на бліжэйшую перспектыву для кожнай канкрэтнай сферы.**

## З акцэнтам на кадры

Падчас сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Наталляй Качанавай Аляксандр Лукашэнка ўзняў шэраг тэм. Першай сярод іх ён назваў аптымізацыю дзяржаўнага апарату.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, да аптымізацыі ніякага павышэння зарплаты ў дзяржапараце «ні на ёту не павінна быць і не будзе. Мы пра гэта ўмовіліся. Другое пытанне — дэбюракратызацыя. Пара ўжо вам прыступаць да гэтага пытання. Гэты працэс таксама не павінны ўпускаць».

Удзяліў увагу кіраўнік краіны і разняволенню дзелавой ініцыятывы. Ён пацікавіўся, калі будуць падрыхтаваны адпаведныя дакументы. Наталля Качанава паведаміла, што працэс іх абмеркавання ўжо скончыўся.

Яшчэ адна тэма, якую ўзняў Аляксандр Лукашэнка падчас размовы — перафарматаванне ў сферы спорту. Па словах кіраўніка дзяржавы, павінен быць глыбокі аналіз тых працэсаў, якія адбываюцца ў нашым спорце. Ён даручыў Наталлі Качанавай гэтае пытанне ўзяць пад кантроль:

— Гэта галоўнае ідэалагічнае пытанне, мы ніколі гэтага не хавалі. Галоўная ідэалогія — гэта спорт, бо спартыўныя спаборніцтвы глядзяць мільёны. Нехта адзін від спорту, нехта — другі. Але гэта ўздзеянне на людзей. Калі дрэнна гуляе каманда — такі і настрой у людзей, добра — гэта натхняе людзей.

Звярнуў увагу Прэзідэнт і на кадравыя пытанні. Ён падкрэсліў, што гэта галоўныя пытанні Адміністрацыі Прэзідэнта:

— Нядаўна абралі Сямёна Барысавіча Шапіру кіраўніком Федэрацыі (Федэрацыі хакея — Заўв. аўт.)... Вельмі вялікую работу прыйдзецца правесці. Я прасіў, каб яго папярэдзілі, што ў нагрузку мы яму дадзім буйное дзяржаўнае даручэнне, нейкі выражам блок для кантролю. Вопыт яго трэба выкарыстоўваць.

Асобным блокам абмяркоўваліся мерапрыемствы на ўзроўні кіраўніка дзяржавы:

— Мы па ЖКГ павінны на ўзроўні кіраўніка дзяржавы разгледзець пытанні і паставіць кропку, мы павінны яшчэ раз вярнуцца да пытанняў будаўніцтва. Магчыма, мы павінны па вёсцы правесці буйное мерапрыемства, па адукацыі. Гэта значыць, пяць-шэсць мерапрыемстваў мы павінны правесці на ўзроўні Прэзідэнта, дзе расставіць усе кропкі над «і». А гэта самыя такія буйныя мерапрыемствы, з вялікім удзелам людзей. Ну і мерапрыемствы меншыя — накшталт спартыўнага, па разняволенні дзелавой актыўнасці — гэта таксама будзе з меншай колькасцю людзей, але мы публічна павінны паставіць кропкі над «і» і ў гэтых працэсах. Гэта ўжо работа Прэзідэнта, яе планаванне...

## Сувязі ўнутры і за мяжой

Учора Прэзідэнт прыняў таксама з дакладам старшыню Следчага камітэта Івана Наскевіча.

— На мінулым тыдні з дакладамі ў мяне былі прадстаўнікі нашага сілавога блока, —згадаў кіраўнік краіны. — Я ім задаваў галоўныя пытанні — як у нас развіваюцца падзеі пасля рэформы праваахоўнай сістэмы. Следчы камітэт мы выдзелілі. Спадзяюся на тое, што следства будзе незалежным, сумленным, прынцыповым... Ці адбылося гэта? Я вам практычна адрасую тое ж пытанне, што і іншым сілавікам, якія мне дакладвалі на мінулым тыдні. Я хачу мець аб'ектыўную інфармацыю: што не атрымліваецца, можа, падтрымка патрэбна нейкая.

Спытаў Аляксандр Лукашэнка і пра шэраг крымінальных спраў, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта. Асобна размова зайшла пра супрацоўніцтва з замежнымі калегамі. Кіраўнік дзяржавы папрасіў не губляць адносін са Следчым камітэтам Расійскай Федэрацыі, у прыватнасці з яго старшынёй Аляксандрам Бастрыкіным.

— У вас устанавіліся, як я разумею, нядрэнныя кантакты у тым ліку і з Федэральным бюро расследаванняў Злучаных Штатаў Амерыкі, з імі трэба падтрымліваць адносіны, таму што вы будзеце пастаянна перасякацца, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт даручыў Івану Наскевічу асабіста разабрацца з непрыемнай сітуацыяй, якая адбылася з Леанідам Пянькоўскім, які нядаўна ўзначаліў Аршанскі райвыканкам. Яна звязана з дзеяннямі аператыўных службаў у дачыненні да службовай асобы:

— Хто даў правы да чалавека, узгодненага да прызначэння Прэзідэнтам, урывацца ў дом? Бо для таго, каб праваахоўным органам нават весці нейкія расследаванні па чалавеку, які ўваходзіць у кадравы рэестр Прэзідэнта, патрэбна згода Прэзідэнта. Уварваліся, пачалі нешта ўдакладняць. Новы чалавек прыйшоў працаваць. Кляймо на ім паставілі. Нядобры сігнал. Матэрыялы ўжо ёсць. Разбярыцеся. Мне патрэбна мужчынская, сапраўдная ацэнка гэтай сітуацыі.

## Праблемы рэгіёна пад кантролем

Падчас сустрэчы з кіраўніком справамі Прэзідэнта Віктарам Шэйманам і памочнікам Прэзідэнта па агульных пытаннях Мікалаем Корбутам Аляксандр Лукашэнка даручыў да канца года істотна палепшыць сітуацыю ў Аршанскім раёне. Перш за ўсё неабходна сканцэнтраваць намаганні на развіцці гарадскіх прадпрыемстваў, бо Орша — магутны прамысловы цэнтр:

— Яны ўсе павінны быць адноўлены, і людзі павінны там працаваць. Яны ўсім нам патрэбныя, яны ўсе выпускаюць прадукцыю, якая нам патрэбна. Урад павінен прыняць рашэнне і ажыццявіць гэтыя меры, на працягу года (максімум паўтара) іх скончыць. Але ў гэтым годзе важна палепшыць сітуацыю ў Оршы. Гэта прывядзе да вырашэння трох асноўных сацыяльных пытанняў: занятасці, заработнай платы, яшчэ адаб'ецца на цэнаўтварэнні.

У аднаўленні маюць патрэбу і іншыя населеныя пункты раёна, у прыватнасці Барань і Балбасава. Тут таксама неабходна прывесці ў парадак прадпрыемствы і даць людзям магчымасць працаваць. Кіраўнік дзяржавы даручыў Віктару Шэйману ўзяць гэтыя пытанні на асабісты кантроль.

Абмяркоўвалася таксама і стварэнне на базе Аршанскага раёна сельскагаспадарчага холдынга і мадэрнізацыя ў гэтай сувязі пасёлка Копысь. Гэтыя пытанні стануць зонай адказнасці Мікалая Корбута.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Трамп: тэрарысты пакланяюцца не Богу, а смерці



Тэрарысты шануюць не Бога, а смерць, заявіў на арабаісламa-амерыканскім саміце ў Эр-Рыядзе прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, закранаючы пытанне міжнароднай барацьбы супраць тэрарызму.

«Калі вы выбіраеце шлях тэрору, то ваша жыццё будзе пустым, яно будзе кароткім», — сказаў ён. «Гэта не барацьба паміж рознымі веравызнаннямі, гэта барацьба паміж злачынцамі-варварамі, якія спрабуюць знішчыць жыццё», — сказаў амерыканскі кіраўнік.

Прэзідэнт ЗША таксама заклікаў перакрыць фінансавыя каналы, якія дазваляюць «Ісламскай дзяржаве» гандляваць нафтай.

«Мы павінны перакрыць фінансавыя каналы, якія дазваляюць ІД прадаваць нафту, дазваляюць экстрэмістам плаціць грошы сваім байцам», — сказаў ён.

Дональд Трамп знаходзіцца з візітам у Саудаўскай Аравіі, дзе бярэ ўдзел у сустрэчы на вышэйшым узроўні Савета супрацоўніцтва арабскіх дзяржаў Персідскага заліва, у які ўваходзяць Сірыя, Катар, Аман, Бахрэйн, ААЭ, Кувейт.

### Расія наладжвае гандаль з КНДР, нягледзячы на санкцыі

Масква, нягледзячы на ўзмацненне жорсткасці міжнародных санкцый, пашырае супрацоўніцтва з Пхеньянам. Расія прадае КНДР вугаль і нафту, паміж абедзвюма краінамі адкрыты паромныя зносіны.

У першым квартале 2017 года тавараабарот паміж Расіяй і Паўночнай Карэяй павялічыўся больш чым на 85 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

Са студзеня па сакавік тавараабарот паміж абедзвюма краінамі склаў каля 32 млн долараў. Ільвіная доля расійскіх паставак у Паўночную Карэю прыпадае на энерганосьбіты. У прыватнасці, Масква экспартавала ў КНДР каменнага вугалю на 22 млн долараў, буры вугаль — на 4,7 млн долараў і нафты — на 1,2 млн долараў.

Варта адзначыць, што прадаваць Пхеньяну сырую нафту не забаронена — санкцыі ААН распаўсюджваюцца толькі на авіяпаліва, за выключэннем дзяржаўнай паўночнакарэйскай авіякампаніі Air Koryo. У сваю чаргу, эксперт КНДР у Расію за гэты перыяд склаў усяго 420 тысяч долараў. У асноўным гэта прадукты хімічнай прамысловасці і, што цікава, духавыя музычныя інструменты.

### Лёгкія цыгарэты выклікаюць асабліва агрэсіўны рак лёгкіх

Папулярныя сёння лёгкія цыгарэты аказаліся асабліва небяспечнымі, таму што выклікаюць адну з самых агрэсіўных формаў раку лёгкіх — адэнакарцыному, гаворыцца ў артыкуле, апублікаваным у часопісе Нацыянальнага інстытута раку.

Так званыя лёгкія цыгарэты адрозніваюцца ад звычайных тым, што ў іх фільтры зроблены набор дзірачак, якія спрыяюць, як заяўляюць вытворцы, ачысціцы дыму ад смол, нікаціну і іншых канцэрагенаў перад пападаннем у лёгкія. Праз гэтыя дзірачкі, па задумцы стваральнікаў, у тытунёвы дым трапляе свежае паветра, якое «разводзіць» яго і робіць менш небяспечным.

«Тытунёвыя кампаніі чарговы раз падманулі ўрачоў і курцоў, прымусіўшы іх думаць, што падобныя цыгарэты больш бяспечныя для здароўя. Атрыманыя намі даныя паказваюць, што існуе цалкам выразная сувязь паміж гэтымі вентыляцыйнымі адтулінамі і эпідэміяй адэнакарцыномы ў апошнія два дзесяцігоддзі», — заявіў Пітэр Шылдс з універсітэта штата Агая ў Каламбусе (ЗША).

■ Новыя тэхналогіі

# ЦЯПЛО АД ШЭРЫХ СЦЁКАЎ

### У Гродне пабудаваны дом, які сам сябе абагрэе

**Урачыстая цырымонія адкрыцця самага сучаснага энергаэфектыўнага шматпавярховіка прайшла з удзелам віцэ-прэм'ера Анатоля КАЛІНІНА, пастаяннага прадстаўніка Праграмы развіцця ААН у Беларусі Санакі САМАРАСІНХІ, мясцовых улад і будучых жыхароў.**



Навасёламі ў новым доме па вуліцы Дзяржынскага стануць 500 гродзенцаў. Многія з іх сабраліся на цырымонію адкрыцця, дзе атрымалі пісьмовую інструкцыю, як правільна карыстацца сваімі кватэрамі. А іх у новым доме роўна 120. Жыхароў папярэдзілі — дом будзе на кантролі не толькі ў прадпрыемства «Гроднажылбуд», якое ўзводзіла будынак, але і ў камунальнай службы. У штат ЖЭСа спецыяльна для абслугоўвання новага аб'екта ўводзяцца пасады інжынера і электрыка.

Новы дом літаральна нашпігаваны складанымі тэхналагічнымі навінкамі, якія звязаны з эканоміяй энергіі. Праект распрацаваны такім чынам, каб максімальна выкарыстаць падземнае цяпло, шэрыя сцёкі (каналізацыю), цяпло градзскога калектара. Устаноўлена сістэма рэкуперацыі, якая дазволіць абагрэць дом без падключэння цэнтральнага ацяплення нават у шасцігрудусныя маразы. Жыхары змогуць рэгуляваць тэмпературу паветра самастойна. А ў кранах пастаянна будзе гарачая вада, незалежна ад сезоннага адключэння. Пры гэтым расход цеплавой энергіі зменшыцца ў тры разы. Жыхарам абяцаюць зніжэнне платы за ацяпленне на 60—80 рублёў у год. Эканомія прадбачыцца і па электраэнергіі — на фасадзе дома і на даху ўстаноўлена 300 сонечных панеляў.

Анатоль Калінін падкрэсліў, што жыллё — галоўнае ў сацыяльнай палітыцы Беларусі:

— Штогод у краіне ўводзіцца больш за чатыры мільёны квадратных метраў жылля. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы вядзецца лінія па зніжэнні яго сабекошту. Да канца года мы павінны выйсці на ўзровень кошту аднаго квадратнага метра жылля, якое ўводзіцца з дзяржпадтрымкай, роўны сярэдняй заработнай плаце па краіне.

Цяпер 60% навабудоўляў узводзіцца з прымяненнем энергаэфектыўных тэхналогій, паведаміў на ўрачыстай цырымоніі віцэ-прэм'ер.

Гродна ўжо мае вопыт узвядзення энергаэфектыўнага дома. Ён знаходзіцца побач з новым і пабудаваны восем гадоў таму. На той момант дом быў тэхналагічна прагрэсіўным, бо дазволіў у 15—20 разоў знізіць спажыванне цяпла. Новы жылы аб'ект мае яшчэ больш опцый, зазначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір ДЗЯШКО:**

— Калі дом першага пакалення спажываў амаль 40 кВт/г на куб. м, то ў доме другога пакалення гэты паказчык складае 15. Магчыма, гадоў праз 10 усё жыллёвае будаўніцтва будзе такім.

Пакуль «разумныя дамы» другога пакалення можна назваць эксперыментальнымі. Іх пабудавана ўсяго тры — у Магілёве, Мінску і цяпер у Гродне. Гэта праект рэалізаваны з дапамогай Праграмы развіцця ААН (ПРААН) Дэпартаментам па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарту і Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Беларусі. Так, па сродкі ПРААН, а гэта 850 тыс. долараў, устаноўлена энергаэфектыўнае інжынернае абсталяванне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМЫ НА МЕСЦАХ

***Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае на планавай аснове ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах. Гэтая работа дазваляе не толькі даведацца і вырашыць існуючыя пытанні, якія турбуюць грамадзян, але і непасрэдна ажыццявіць маніторынг сітуацыі на месцах.***

На гэтым тыдні прыёмы пройдуць у Віцебскай і Брэсцкай абласцях, а таксама ў Мінску па наступным графіку:

**24 мая з 9.00 да 12.00**

**КАЛІНІН Ігар Іванавіч** — начальнік аддзела аналізу і кантролю галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта (месца прыёму — адміністрацыя Фрунзенскага раёна г. Мінска);

**25 мая з 14.00 да 16.00**

**КАРПЯК Уладзімір Валянцінавіч** — памочнік Прэзідэнта, інспектар па г. Мінску (месца прыёму — адміністрацыя Заводскага раёна г. Мінска);

**26 мая з 10.00 да 13.00 (месца прыёму — Ваўкавыскі райвыканкам), з 15.30 да 18.30 (месца прыёму — Зэльвенскі райвыканкам)**

**ШЛЫК Рыгор Іванавіч** — начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта;

**27 мая з 08.30 да 11.30**

**ШЛЫК Рыгор Іванавіч** — начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта **(месца прыёму — Слонімскі райвыканкам)**.

*Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў і адміністрацый раёнаў г. Мінска (Заводскі раён — 2951581, Фрунзенскі раён — 2072158).*

■ Сітуацыя

# РАКА РАЗЛАДУ

## Чаму рыбакі супраць арэнды ўчастка Прыпяці

**У мінулыя выхадныя ў Мазыры на акцыю пратэсту выйшлі мясцовыя рыбакі. Прычына такая: аматары рыбнай лоўлі не жадаюць, каб адрэзак ракі Прыпяць працягласцю ў 91 кіламетр і прылеглыя вадаёмы плошчай 302 гектары здавалі ў арэнду. Наш карэспандэнт паспрабаваў высветліць, у чым заключаюцца прычыны канфлікту.**




### ЦАНА ПЫТАННЯ

— Усё пачалося ў красавіку, калі ў раённай газеце з'явілася аб'ява аб магчымай арэндзе ўчастка Прыпяці, — успамінае **адміністратар суполкі «Супраць арэнды Прыпяці» ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» Генадзь САМУЙЛІК.** — Чытачы адразу пачалі абурацца ў каментарыях: «Як так можна?», «Навошта гэта рабіць?» Сам я даведаўся, калі людзі пачалі тэлефанаваць.

Па словах Генадзя, рашэнне аб'ядноўвацца, каб змагацца супраць падобнай ініцыятывы, прыйшло адразу. Цяпер суполка ў сацыяльнай сетцы налічвае больш за 1700 чалавек, а петыцыю супраць арэнды падпісалі ўжо 5200 чалавек. Больш за тое, сёння любы можа набыць наклейку на аўтамабіль з надпісам «Супраць арэнды ракі Прыпяць». Мяркуючы па колькасці фотаздымкаў у інтэрнэце, ахвотнікаў нямала.

Чаму ж рыбалоўная супольнасць Мазырскага раёна выступае супраць магчымага арандатара? На думку **мясцовага рыбака Дзмітрыя БАГАЧОВА,** прамысловае рыбалоўства не мае эканамічнага абгрунтавання і шкодзіць экалагічнаму стану вадаёма. Акрамя таго, платнае аматарскае рыбалоўства, па словах суразмоўніка, атрымліваецца неапраўдана дарагім. У прыклад Дзмітрый прывёў такія кошты: «За самы танны варыянт — 18 рублёў у дзень з берага, 40 рублёў — з лодкі, інтэнсіўная лоўля — 70 рублёў».

— Вельмі высокі цэннік для рыбаловаў-аматараў і смецце на берагах. Нічога не зроблена — адбываецца толькі промыславы ўлоў, — лічыць Генадзь Самуйлік.

Аднак мы даведаліся пра цэны на адным з участкаў, напрыклад, у Петрыкаўскім раёне: кошт рыбалкі з берага да 5 кручкоў складае 10 рублёў, а на 1 кручок — бясплатна. Кошт рыбалкі з лодкі да 10 кручкоў — 17 рублёў 50 капеек, у такую ж суму ацэньваецца і інтэнсіўная лоўля. Абанемент для прыезджых трохі даражэйшы, чым абанемент для мясцовых рыбакоў.

«Мы прапанавалі выканкаму адкрыць разліковы рахунак, на які кожны рыбак будзе пераводзіць пэўную суму — напрыклад, адну базавую велічыню ў год, — расказаў Генадзь. — Думаю, што сабралася б шмат рыбакоў, якія гатовы заплаціць». На думку актывіста, грашовыя сродкі можна было б пусціць на прыборку смецця і акультурванне, а рака такім чынам атрымала б сумленнага арандатара — народ. Але ўлады не падтрымалі гэтую прапанову, спаслаўшыся на адсутнасць заканадаўчай базы. Дарэчы, актывісты прыходзілі на сустрэчы з уладамі, аднак, па іх словах, ніякага выніку яны не далі.

— Што будзе, калі гэтую частку ракі перададуць арандатару? Мы на гэтым не спынімся. Мы супраць прамысловай лоўлі і выступаем за адэкватны кошт, — падкрэсліў Генадзь. — Мы разумеем, што на рацэ нічога зроблена не будзе. Адразу пачнуць выбіваць рыбу.

— Гэта не будзе пройгрыш. Мы будзем змагацца да канца, — дадае Дзмітрый.

### ДЛЯ МЕСЦІЧАЎ — БЯСПЛАТНА

У Мазырскім раённым выканаўчым камітэце гэтым пытаннем займаецца **кіраўнік справамі райвыканкама Вераніка БАЙКОВА**. Яе мы і папрасілі пракаментаваць прэтэнзіі рыбакоў.

— Па-першае, гэта агульнарэспубліканская практыка, і мы не адзіны раён, які вырашыў здаць частку ракі ў арэнду, — адзначыла спецыяліст. — Акрамя таго, рашэнне аб здачы ў арэнду прымалася Гомельскім аблвыканкамам. У паўнамоцтвы нашага ведамства ўваходзіць толькі правядзенне таргоў, а дагавор заключаецца ў Гомелі.

Асобна кіраўнік справамі выканкама абвясціла: для жыхароў Мазырскага раёна і горада Мазыра аматарскае рыбалоўства будзе бясплатным. «Больш за тое, адрэзак ракі, які ў межах Мазыра — а гэта каля 13 кіламетраў, — увогуле не будзе здавацца ў арэнду. Рыбакі як сядзелі на беразе, так і будуць сядзець, — сказала яна. — Людзі таксама выказваюць боязь, што ім забароняць наведваць месцы для адпачынку. Падкрэсліваю: ні арандатар, ні хто-небудзь іншы не мае права абмяжоўваць доступ людзей для адпачынку, гаворка ідзе аб здачы ў арэнду толькі рыбалоўных угоддзяў».

Арандатар будзе займацца не толькі прамысловым уловам, але і доглядам самой ракі і берагавых участкаў, забеспячэннем аховы рыбных запасаў ад браканьераў і многім іншым, запэўніваюць у райвыканкаме. «Пры сустрэчах з людзьмі мы тлумачылі: калі вы не давяраеце, то можаце арганізаваць актыў і ўдзельнічаць, дапамагаць», — дадала Вераніка Байкова.

Заяўку на ўдзел у аўкцыёне аб арэндзе трэба было падаць да 16 мая ўключна. У выніку ўсе ўмовы пры падачы дакументаў выканала толькі адна арганізацыя — мазырскае таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Аўкцыён адбыўся ўчора, 22 мая. Вераніка Байкова падкрэсліла, што калі арандатар будзе парушаць умовы пагаднення, то за гэтым можа адбыцца скасаванне дагавора.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «ДЗЕЛЯ ДОБРАГА НАСТРОЮ ЛЮДЗЕЙ...»

**Валянціна ГАМІНА, супрацоўнік Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага:**



— З першага разу газету цалкам не чытаю. Люблю адразу прагледзець увогуле, каб адчуць яе інфармацыйную аўру, настройваю свой чытацкі інтарэс.

«Звязда», на мой погляд, газета-інтэлектуалка, інфарматарка жыцця не толькі Беларусі, але ўсяго свету. Тут знаходзяць сваё месца актуальныя матэрыялы жыцця грамадства з усіх куткоў Беларусі, тэмы самыя розныя. Мяркую, што 100-гадовы вопыт працы таксама дапамагае ў гэтым.

Яна ж яшчэ і газета-барацьбіт, газета-партызанка, двойчы ардэнаносная працаўніца. А яшчэ сёлета спаўняецца 90 гадоў, як яна друкуецца на беларускай мове.

Чытаю не толькі так званы «афіцыёз». Калі што не ідзе да ладу, перачытваю старонкі «Хто каго» ці «Вясёлыя гісторыі чытачоў». Во дзе скарбніца народнай смакавітай гаворкі, прыказак, жарту для добрага настрою! Напрыклад: «Не гаруй ты, мілка, дужа, што нясу табе не ружы». Што могуць перагаварыць адзін аднаго толькі беларусы. Дарэчы, а чаму «Звяздзе» не выдаць зборнік розных народных перагаворак, а можа, вясёлых гісторый? Дзеля добрага настрою людзей.

Захапляюся таленавітымі фотаздымкамі: сюжэтнымі, партрэтнымі з прыгожымі тварамі людзей, з прыродай нашай роднай старонкі. І за гэта ўсё шчыры дзякуй звяздоўцам.

■ Мы пісалі — нам адказалі...

# ДАРОГА ДА ШКОЛЫ СТАНЕ ЛЯГЧЭЙШАЙ

**31 сакавіка ў «Звяздзе» быў апублікаваны артыкул Святланы Бусько «Мне нельга нараджаць хлопчыкаў», у якім ішла гаворка пра маці дваіх невылечна хворых дзяцей з інваліднасцю.**

Адной з праблем, якая напаткала гэту сям'ю, аказаліся цяжкасці з тым, як дабірацца ў школу з безбар'ерным асяроддзем старэйшаму сыну героіні артыкула. Бацьку нават прыйшлося звольніцца з працы, каб штодзённа адвозіць дзіця ў школу, у выніку чаго шматдзетная сям'я з трыма дзецьмі зараз жыве на дзіцячую пенсію і дапамогу па доглядзе дзіцяці.

Пасля публікацыі артыкула рэдакцыя атрымала адказ ад Мінгарвыканкама за подпісам **намесніка старшыні Ігара ЮРКЕВІЧА**, у якім, у прыватнасці, гаворыцца, што «дастаўка навучэнцаў ад месца жыхарства да месца навучання і назад, у тым ліку навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на спецыяльна абсталяваным транспарце знаходзіцца ў кампетэнцыі выканаўчага органа па месцы знаходжання ўстановы адукацыі. У дадзеным выпадку гэта адміністрацыя Ленінскага раёна горада Мінска. На балансе ўпраўлення адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Ленінскага раёна горада Мінска ёсць два аўтобусы і два мікрааўтобусы. Пераабсталяваць існуючыя мікрааўтобусы для арганізацыі падвозу дзяцей-інвалідаў не ўяўляецца магчымым, паколькі дадзены транспарт не абсталяваны антыблакавальнай тармазной сістэмай, і яго экалагічны клас не адпавядае нарматывам».

Разам з тым намеснік старшыні Мінгарвыканкама згадвае, што адміністрацыя Ленінскага раёна звярталася з просьбай аб аказанні бязвыплатнай спонсарскай дапамогі на набыццё аўтобуса ў арганізацыі Мінска, аднак зварот не знайшоў водгуку ў кіраўнікоў арганізацый.

Кіраўніцтва Мінгарвыканкама запэўнівае, што ўпраўленнем адукацыі будуць прыняты неабходныя меры па арганізацыі дастаўкі дзіцяці-інваліда да ўстановы адукацыі і назад у тэрмін да 1 верасня 2017 года. Таксама ў ходзе звароту сям'і Кірыенка была аказана матэрыяльная дапамога для дзяцей-інвалідаў у памеры 500 рублёў кожнаму дзіцяці.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# КУПАЛА КРОЧЫЦЬ ПА СЛАВАКІІ

**У Браціславе пабачыла свет кніга Янкі Купалы на славацкай мове.**

Ініцыятар выдання зборніка «А хто там ідзе?» і адзін з перакладчыкаў вершаў класіка беларускай літаратуры — спадар Мар'ян Серватка. Ён працаваў у Беларусі Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Славакіі. І сувязяў з нашай краінай не пакідае і зараз. Стараецца наведваццa ў Беларусь як мага часцей. Сябруе з Купалаўскім музеем у Мінску. Імкнецца як мага актыўней далучаць да сяброўства з беларускай літаратурай пісьменнікаў Славакіі. Сёлета Мар'ян Серватка ўдзельнічаў у міжнародным сімпозіуме «Пісьменнік і час», які Міністэрства інфармацыі і Саюз пісьменнікаў Беларусі ладзяць штогод у лютым пачынаючы з 2015 года.

Кніга Янкі Купалы «А хто там ідзе?» — сапраўдны падарунак да 135-годдзя з дня нараджэння народнага песняра Беларусі.

**Сяргей ШЫЧКО.** *shychko@zviazda.by*

■ Здарэнні

# ГАРЭЎ ГІСТАРЫЧНЫ АБ'ЕКТ, АХВЯР НЯМА

## Пажар на былым піўзаводзе ў Гродне тушылі амаль дзве гадзіны

**У нядзелю, каля 16 гадзін жыхары абласнога цэнтра заўважылі полымя і чорны дым на тэрыторыі старога піўзавода, які знаходзіцца на беразе Нёмана. Праз некалькі хвілін пажарныя прыступілі да барацьбы з адкрытым агнём.**

Як паведамілі ў Гродзенскім абласным упраўленні МНС, пажар узнік у трохпавярховым будынку. Агонь знішчыў увесь дах, выгарэлі памяшканні трэцяга паверха. Поўнасцю ліквідаваць пажар удалося толькі праз дзве гадзіны.

На тушэнні аб'екта было задзейнічана 17 адзінак тэхнікі. Дзякуючы хуткаму рэагаванню службы МНС удалося не дапусціць распаўсюджванне агню на ніжні паверх і суседнія будынкі.

Прычына пажару ўстанаўліваецца. Цяпер разглядаюцца дзве версіі — неасцярожнае абыходжанне з агнём і падпал. Здарэннем займаюцца спецыялісты МНС, РАУС і Следчага камітэта.

Як паведамілі краязнаўцы, будынак былога піўзавода — адзін з самых старых у Гродне. Ён пабудаваны на беразе Нёмана ў 1665 годзе як палац-крэпасць магнацкага роду Сапегаў і за гэты час ні разу не гарэў. Комплекс мае статус гістарычнага помніка, але ніхто не бачыў там ахову. Яе папросту тут не было.

Завод неаднаразова выстаўляўся на аўкцыён, але так і не прыдбаў належных інвестараў. Ад апошняга ўладальніка аб'ект быў забраны зусім нядаўна, у лютым гэтага года, і перададзены ў камунальную ўласнасць горада. Інвестар так і не прыступіў да рэканструкцыі комплексу, а будынкі толькі прыходзілі ў занапад.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

### Наша даведка:

**Вялікую перабудову на месцы былога палаца зрабіў у 70-я гады XIX стагоддзя новы ўладальнік Іосіф Кунц, які адкрыў тут півварны завод. Аўтар праекта — архітэктар Вало, у гэтым выглядзе завод дайшоў да нашых часоў. Вядома, што пад заводам знаходзяцца падвалы з цыліндрычнай столлю, вышыня якой дасягае 6 метраў. Падчас акупацыі немцы вывезлі абсталяванне ў Германію. Пасля рэканструкцыі ў 50-х гадах XX стагоддзя завод вярнуўся да выпуску піва, але не змог канкураваць з іншымі вытворцамі, і роўна 10 гадоў таму, у год 30-годдзя, яго закрылі.**

■ Занятасць

# Хто хоча працаваць, шукае работу

**Клецкі райвыканкам з 20 сакавіка забараняе прыём і звальненне работнікаў арганізацый без пісьмовага ўзгаднення з райвыканкамам, а таксама ўтойванне вакансій. Асабістая адказнасць за гэта ўскладаецца на кіраўніка арганізацыі і спецыялістаў па кадрах. Праўда, гэтае рашэнне датычыцца толькі дзяржаўных прадпрыемстваў.**

— За мінулы год у нас уладкавана на працу 987 чалавек. Акрамя таго, мы аказваем дапамогу ў перанавучанні кадраў, выдзяляем субсідыі для адкрыцця прыватнай справы, — расказвае **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Клецкага райвыканкама Ала МЯЛЮК.** — У раёне створана камісія па працаўладкаванні незанятых у эканоміцы грамадзян, якую ўзначальвае старшыня райвыканкама Генадзь Салавей.




У прынцыпе, колькасць вакансій на Клеччыне перавышае колькасць беспрацоўных. Праўда, назіраецца некаторы дысбаланс паміж попытам і прапановай рабочай сілы. Калі раней рынак працы быў арыентаваны на рабочыя спецыяльнасці — каля 75% прэтэндэнтаў, то цяпер з'явілася шмат вакансій для кваліфікаваных спецыялістаў: медыкаў, ветурачоў.

— Даводзіцца ўлічваць гэтыя моманты. Пры звароце чалавека імкнёмся падабраць месца адпаведна яго кваліфікацыі, адукацыйнаму ўзроўню. Мы ладзім кірмашы вакансій, куды запрашаем кіраўнікоў суб'ектаў гаспадарання. Яны лепш ведаюць сітуацыю на сваіх прадпрыемствах, у арганізацыях. Нехта з працаўнікоў збіраецца ў дэкрэтны адпачынак, а хтосьці — на пенсію. Сёння няма вакантнага месца, яно з'явіцца праз тыдзень, месяц, — кажа Ала Мікалаеўна.

Ёсць прадпрыемствы, якія набіраюць людзей на часовыя работы. Напрыклад, ААТ «Гама смаку» стварала рабочыя месцы ў сувязі з вытворчай неабходнасцю — ачысткай гародніны. Сезонныя работы арганізоўвае лясгас, сельвыканкамы па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні. На гэтыя мэты выдзяляюцца сродкі з фонду сацыяльнай абароны.

— Ёсць і такія грамадзяне, якія прыходзяць на пасяджэнне камісіі, але ад працаўладкавання адмаўляюцца. Зрэшты мы наведалі ўсіх, хто быў у спісах. Вывучылі іх адукацыйны ўзровень, пажаданні. Частка з іх не пражывае на тэрыторыі раёна, нехта жыве за мяжой, хтосьці ўжо знайшоў працу. Іншыя ездзяць на заробкі ў Расію, хтосьці мае ценявыя даходы. Яны адразу казалі, што гатовы заплаціць падаткі. Сустракаліся людзі, якія не працуюць гадамі, і прызнаваліся, што ім ужо цяжка ўвайсці ў працоўны рытм, — канстатуе Ала Мялюк.

**Усяго наведалі больш як 900 чалавек, але 30% з іх так і не дайшлі да наймальніка. А былі выпадкі, што чалавек адпрацаваў усяго два дні і больш на работу не прыходзіў...**

Разам з тым камісія праводзіць і выязныя пасяджэнні ў сельскай мясцовасці з запрашэннем жыхароў, кіраўнікоў арганізацый аграпрамысловага комплексу. Усіх беспрацоўных азнаёмілі з вакансіямі і рэжымам работы камісіі пад роспіс. Усяго наведалі больш як 900 чалавек, але 30% з іх так і не дайшлі да наймальніка. А былі выпадкі, што чалавек адпрацаваў усяго два дні і больш на работу не прыходзіў...

Словам, хто хоча працаваць — шукае работу. А хто не хоча працаваць — шукае прычыну.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# ІНТЭРНЭТ І ДЗЕЦІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Сёння мы заўважаем, што вопыт перадаецца ўжо не ад старэйшых да малодшых, а часам наадварот, асабліва ў галіне інфармацыйных тэхналогій, і адпаведна, выхаванне ў сям'і церпіць некаторыя няўдачы, бо дзеці больш выхоўваюцца тымі ж сродкамі масавай інфармацыі, інтэрнэтам, — расказвае **галоўны пазаштатны дзіцячы псіхатэрапеўт Міністэрства аховы здароўя, загадчыца псіхатэрапеўтычнага аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага дзіцячага псіхіятрычнага дыспансера Алена НАВІЦКАЯ.** — Калі раней актуальным для бацькоў быў кантроль «вулічнага выхавання», то цяпер гэтай «вуліцай» стаў інтэрнэт, дзе яшчэ больш складана пракантраляваць, з кім сябруе наша дзіця.

**Генетычная схільнасць да аўтызму можа нават і не праявіцца, калі выкарыстоўваць інтэрнэт толькі дзеля справы і засяродзіцца спачатку на нармальным вынашванні дзіцяці, а пасля на яго нараджэнні і развіцці.**

Яскравым прыкладам адмоўнага ўплыву на дзіцячую псіхіку стала, напрыклад, распаўсюджванне такога захворвання, як нервовая анарэксія (калі дзяўчынкі і нават хлопчыкі пачынаюць лічыць сябе вельмі тоўстымі, будучы нават празмерна худымі, і наогул адмаўляюцца ад ежы). Усё часцей сустракаецца і нервовая булімія (калі паглынаецца велізарная колькасць ежы з наступным выклікaннем ванітаў). Развітыя краіны сутыкнуліся з гэтым гадоў трыццаць таму, калі ў нас размова ішла пра адзінкавыя выпадкі хворых з цяжкімі псіхічнымі расстройствамі. А цяпер і ў нас некалькі падлеткаў на тыдні аказваюцца на прыёме ў дзіцячага псіхатэрапеўта. Звязана гэта, у першую чаргу, з асаблівасцямі выхавання, але масла ў агонь падлівае, безумоўна, і інтэрнэт. Падлеткі любяць гуртавацца, лідзіравацъ, і толькі нехта пачынае дэманстраваць на фота свае «ножкі, як у матылька», як гэтага пачынаюць хацець і іншыя. Добра, калі пабач адкрытыя, душэўныя тата з мамай, з кім можна спакойна ўсё гэта абмеркаваць... Але ж не ўсім шчасціць з ідэальнымі бацькамі.

Другая крайнасць — лішняя вага, якую мае па розных даных ад 25 да 32 працэнтаў усіх дзяцей (ад 0 да 18 гадоў). У ЗША, дарэчы, размова ідзе пра больш як 80 працэнтаў, і такая сусветная тэндэнцыя павінна насцярожыць нас ужо сёння. Бо там, дзе лішняя вага, там, як правіла, і метабалічны сіндром з яго павышаным артэрыяльным ціскам (больш як на 10 працэнтаў ад узроставай нормы), высокім узроўнем глюкозы і халестэрыну. Павышаны халестэрын выяўляецца ўжо нават у 5—7 гадоў, а вылечыць гэта, як і іншыя пералічаныя захворванні, з дапамогай толькі таблетак практычна немагчыма. Урэшце ў будучым гэта — ахвяра ішэмічнай хваробы сэрца, інфаркту, інсульту, цукровага дыябету...

— Схільнасць да такіх захворванняў закладваецца яшчэ падчас цяжарнасці, калі мела месца затрымка развіцця плода, або пазней, пасля з'яўлення на свет, калі дзіця было на штучным кармленні, і далей, калі ад 1 да 3 гадоў харчаванне было няправільным, — тлумачыць **загадчыца лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў РНПЦ «Маці і дзіця», кандыдат медыцынскіх навук Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ.** — Генетычная схільнасць мае значэнне, але самым важным быў і застаецца здаровы лад жыцця. Неабходна арганізаваць рэжым вучобы і адпачынку, забяспечыць дзіцяці дастатковую фізічную актыўнасць праз гульні на свежым паветры і жывыя кантакты з раўеснікамі. Аднак калі ж наша дзіця прападае ў інтэрнэце, мала рухаецца, гэта пагражае не толькі наборам вагі, але і псіхалагічнай залежнасцю ад інтэрнэту, праблемамі з самаацэнкай, з тым, як дзіця будзе суадносіць сябе з навакольным светам. Трэба шукаць спосабы замяшчэння віртуальнага свету рэальным.

Бацькі абавязаны адсочваць час, які дзеці праводзяць каля камп'ютара ці з мабільным у руках. Таму што дакладных метадаў барацьбы з такога кшталту залежнасцю не існуе, у тым ліку і ў сусветнай практыцы. І чым раней з'явілася такая залежнасць, чым раней рэальныя стасункі былі падменены віртуальнымі, тым большая верагоднасць развіцця і ўсіх пералічаных вышэй праблем са здароўем, уключаючы блізарукасць з парушэннем паставы.

Больш за тое, пастаяннае знаходжанне ў інтэрнэце, атрыманне адтуль бясконцага патоку інфармацыі ніяк не забяспечвае высокі інтэлект. Пры механічным атрыманні інфармацыі не ўтвараюцца новыя сувязі паміж нейронамі, зніжаецца іх функцыя — мозг усё ж такі павінен «працаваць», а не перагружацца тым, што не паспявае асэнсаваць. На кожным этапе развіцця дзіця ў стане ўспрымаць і засвойваць пэўную колькасць інфармацыі. Так было 50 гадоў назад, так гэта ёсць і сёння. Але цяпер у нас з'явілася яшчэ і паняцце інфармацыйнага неўрозу, звязанага з тым, што патокі інфармацыі не засвойваюцца няспелым мозгам і нервовай сістэмай. Таму па меры сталення дзіця павінна асвоіць жывыя стасункі, разабрацца, хто яно ёсць і што яму трэба, займець нейкі інтарэс, навучыцца прымаць рашэнне, каб натыкаючыся на штосьці разбуральнае ў інтэрнэце, здолець абысці гэта. Інакш не дзіця будзе валодаць інтэрнэтам, а інтэрнэт ім.

Даследаванні маскоўскіх спецыялістаў наогул паказалі, што такі сур'ёзны псіхіятрычны дыягназ, як аўтызм (калі абцяжарваюцца кантакты з навакольнымі) атрымаў у нашы дні шырокае распаўсюджванне таксама дзякуючы павелічэнню ролі віртуальнага свету. Генетычная схільнасць да аўтызму можа нават і не праявіцца, калі выкарыстоўваць інтэрнэт толькі дзеля справы і засяродзіцца спачатку на нармальным вынашванні дзіцяці, а пасля на яго нараджэнні і развіцці ў першыя гады без ускладненняў.

Бяда, а не радасць, калі 6-гадовае дзіця спраўляецца з функцыямі мабільнага, але ўсё яшчэ карыстаецца памперсам! Насамрэч інтэлектуальнае развіццё пачынаецца з асваення той жа прыбіральні. Да 7 гадоў бацькі павінны закласці шмат такіх навыкаў, у тым ліку рухавага ладу жыцця і правільнага харчавання, у якім павінны прысутнічаць бялкі, вугляводы, тлушчы жывёльнага і расліннага паходжання. Нельга дапускаць у дзяцей вегетарыянства, якое пагражае астэапарозам і анеміяй. На думку спецыялістаў, неабходна павышаць адказнасць бацькоў за здароўе сваіх дзяцей. Усё ж такі і прадукты ім выбіраюць дарослыя, і грошы на спартыўную секцыю яны даюць (ці не даюць). І цёплыя стасункі ў сям'і — іх задача.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## Пра камп'ютарную залежнасць

**Дыягназу такога не існуе. Размова ідзе, як правіла, пра гульняманію. Праблема ў тым, што атрыманне выніку, дасягненне поспеху ўплывае на нашы паводзіны. У віртуальнай гульні нас не пакідае ўражанне, што мы нібыта заўсёды крышку выйгралі, вось яшчэ б крыху — і дакладна выйгралі б. Нервовыя сувязі ў галаўным мозгу пачынаюць пры гэтым будавацца няправільна, узнікае паталагічнае жаданне атрымаць эйфарыю зноў і зноў. Нездарма такія залежныя паводзіны фарміруюцца найперш у людзей, схільных да дэпрэсій, няўпэўненых у сабе, якія праз гульню атрымліваюць сваю долю поспеху і значнасці, а таму маюць патрэбу ў дапамозе спецыялістаў.**

**Калі ваша дзіця злоўжывае інтэрнэт-гульнямі, значыць, варта разважаць над тым, чаму яно ўцякае з рэальнасці. Нельга дапускаць, каб працэс гульні суправаджаўся яшчэ і праслухоўваннем музыкі або ўжываннем ежы. Усе гэтыя дзеянні павінны быць асэнсаванымі. Маладым жа мамам, якія не жадаюць сутыкнуцца з залежнасцямі сваіх дзяцей у будучым, можна параіць абмяжоўваць час свайго знаходжання ў тых жа сацыяльных сетках. Нельга «завісаць у нэце» падчас груднога кармлення. Гэта ж самы цесны, цёплы кантакт з дзіцем! Яго неабходна перажываць, адчуваць! Гэта пойдзе на карысць малому: ва ўзросце да 1 года фарміруецца наш базавы давер да свету, эмацыянальная сфера, і лепш за ўсё гэтаму садзейнічае груднае кармленне.**

## Для забавы і для справы

**Інтэрнэт нельга назваць татальным злом. Гэта выдатныя магчымасці не толькі для забавы, але і для справы. Бацькам і настаўнікам, дарэчы, для захавання ўласнага аўтарытэту не перашкодзіць актыўна асвойваць сучасныя праграмы і электронныя прыстасаванні. Шмат трэкераў, датчыкаў вельмі дапамагаюць падтрымліваць здаровы лад жыцця. Важна навучыцца самім і навучаць дзяцей фільтраваць інфармацыю, карыстацца ёю для павышэння сваёй адукаванасці.**

# АД ЛЯСНОЙ — ДА НЯМНОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З Гродна ў бок канала накіроўваемся ў другой палове дня. Шлях невялікі — каля 40 кіламетраў. Дарога — з добрым асфальтавым пакрыццём, часткова рамантавалася за кошт трансгранічнай праграмы, на пад'ездзе да канала асобна выведзена паласа для веласіпедыстаў. Едзем да самай беларуска-польскай мяжы, адкуль бярэ пачатак новы маршрут.

Асфальт змяняе гравійка, а прырода вакол становіцца больш дзікай. Яно і зразумела — тэрыторыя доўгі час з'яўлялася пагранічнай зонай з абмежаваным доступам. Цяпер пагранічны патруль «працуе» на турыстаў: дапамагае дабрацца да сезоннага пункта пропуска на памежным шлюзе. Гэта бязвізавая зона для замежных турыстаў, тут з нядаўніх часоў, акрамя воднага, дзейнічаюць пешы і веласіпедны рух.

## Аўгустоўскае кола

Адсюль, з беларуска-польскай мяжы, а канкрэтна з вёскі Лясная, і пачынаецца веламаршрут №433. «4» — гэта транспартны код рэгіёна, а 33 — колькасць усіх маршрутаў — водных, пешых і веласіпедных.

— Няўжо мала тых, што ёсць? — пытаюся ў сваіх спадарожнікаў.

Аказваецца, новы маршрут не зусім звычайны. Ён упершыню закальцуе беларускую частку Аўгустоўскага канала.

— У нас ёсць маршрут «Аўгустоўскі шлях», які праходзіць уздоўж канала праз усе чатыры шлюзы, ён мае працягласць 25 км. Ёсць «Лінія Молатава» — па дотах Гродзенскага ўмацавальнага раёна. Маршрут «Лісіная гара» цягнецца па канале і ваколіцы ажно на 72 кіламетры, — паведамляе **намеснік старшыні абласнога аб'яднання Рэспубліканскага турыстычна-спартыўнага саюза Сяргей КАЛЯДА.** — Новы маршрут захопіць цікавыя пункты кожнага маршруту і дасць больш поўнае ўяўленне аб канале, бо пройдзе па абодвух баках.

Магчыма, не кожны спачатку асіліць усе 50 кіламетраў, кажа аматар велаexisting руху. Тады можна скараціць кальцо і перасячы канал па адным з чатырох шлюзаў альбо пераправіцца на пароме, які працуе некалькі гадзін на дзень. **Дырэктар канала,** таксама член экспедыцыі **Эдмунд ЮТКОЎСКІ**, запэўнівае, што арганізаваныя турысты пераправіцца могуць і па-за графікам.

## Экспанат пад нагамі

Што цікавага давялося ўбачыць на будучым маршруце? Можна заўважыць, як маляўнічая прырода ўступае месца цывілізацыі. Паступова беларуская частка канала, а гэта 21 км, набывае абжыты выгляд. Уздоўж берага відаць альтанкі, месцы адпачынку, пункты пракату і веластаянкі. Працуе 9 аграсядзіб.

Таксама ёсць некалькі баз, дзе можна пераначаваць. Але іх пакуль недастаткова. Напрыклад, некалькі гадоў вядзецца рамонт гасцініцы-хостэла, дзе раней быў інтэрнат для работнікаў цаглянага завода. Знешні выгляд набліжаецца да сучасных стандартаў, цяпер трэба накрыць дах і правесці ўнутраныя работы.

Дарэчы, цагляны завод тут існаваў да пачатку рэканструкцыі канала. Згодна з праектам ён павінен быў стаць адным з аб'ектаў турызму, бо працаваў некалькі стагоддзяў. З цэглы, выробленай на гэтым заводзе, будаваліся шлюзы канала. Але, на жаль, завод разбурылі. На маршруце можна знайсці гэта месца — там і цяпер ляжаць абпаленыя цагліны. Некалькі фрагментаў мы падабралі для музейнай экспазіцыі. На канале ёсць два музеі — прыватны і дзяржаўны, дзе можна пачуць гісторыю канала і ўбачыць цікавыя экспанаты.

— Турыстычны маршрут — гэта не проста вандроўка з аднаго пункта ў другі. Гэта агляд навакolля, дзе захавалася нямала цікавых рэчаў, — лічыць Сяргей Каляда. — Вось на развілцы стаіць магутны дуб, а побач крыж-абярэг. Значыць, недалёка вёска. Адсюль відаць сядзіба Гурскіх у вёсцы Радзівілкі, там цяпер прадпрымальнік уладкоўвае вялікі комплекс з кафэ і гасцініцай.

Да сядзібы вядуць некалькі дарог, але не па кожнай можна праехаць. Добры на першы погляд жвіровы тракт раптам перасякае вялізная лужа, праз якую нават наш «бус» не пераправіцца. І абмінуць немагчыма — з абодвух бакоў вадаёмы...

## Па ўзгорках і гушчары

Калі трапілі на высокі пагорак, узнікла пытанне — як тут праехаць? На мікрааўтобусе складана, але на веласіпедзе — без праблем. Такія ўчасткі цікавыя для турыста, ды і тэхніка цяпер сучасная — веласіпед з шырокімі коламі, добрай грунтазачэпкай, дыскавымі тармазамі.

Некаторыя дарогі за кароткі час былі падсыпаны, выраўнены, ачышчана прыдарожная паласа. Дырэктар канала Эдмунд Ютkoўскі расказаў, што сіламі прадпрыемства «Гроднамеліявадгас» зроблены падыходы да «Лініі Молатава». Гэта ланцуг дотаў, якія ў Другую сусветную вайну будаваліся на заходняй мяжы. Некаторыя знаходзяцца паблізу канала, іншыя крыху далей.



Углыбіўшыся ў лес, падыходзім да аднаго з буйных дотаў. Шыльда сведчыць, што гэта гістарычная каштоўнасць. Ваенны аб'ект напалову разбураны. Ёсць нямала гістарычных фактаў аб тым, як ваяваў Гродзенскі ўмацаваны раён. Вось толькі на веласіпедзе да большасці дотаў не пад'ехаць. Некаторыя ўчасткі сапраўды нагадваюць старажытныя стаянкі яцвягаў. Кажуць, што назвы вёсак паходзяць з тых самых часоў.

— Для маршрута мы выбіралі дарогі, каб не нашкодзіць прыродзе, мінімальна ўмешвацца ў яе, — падкрэслівае Сяргей Каляда. — Лясных дарог тут сапраўды нямала, маршрут будзе ісці большай часткай менавіта па іх. Які сэнс весці яго па асфальце? У рэшце рэшт, нам важна, каб «Яцвяжскі» адпавядаў экалагічнасці, пралягаў па цікавых аб'ектах і быў пасільным для турыстаў.

## Напрыканцы

Вызначыўшы месцы для маркіровачных слупкоў і стэндаў, наша брыгада стала рухацца ад канала. Прызнацца, захацелася вярнуцца сюды зноў, але ўжо не на «бусе», а на веласіпедзе — з пракатам тут няма праблем, на канале такіх пунктаў некалькі.

Вось толькі прыйдзецца цягнуць з сабой прадукты, бо падсілкавацца тут не ўдасца. А можа, у новым сезоне што-небудзь зменіцца?

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

### Наша даведка:

**На тэрыторыі Гродзенскай вобласці пракладзена 170 кіламетраў асфальтавых веладарожак. Распрацавана 52 маршруты агульнай працягласцю 1330 км. Абсталявана 370 велапарковак і 25 пунктаў пракату. Паслугі па рамонтце аказваюць 16 веламайстэрняў.**

### У тэму

**Дзмітрый КЛІМЯНОК, намеснік кіраўніка адміністрацыі СЭЗ «Гроднаінвест»:**

— Парк «Аўгустоўскі канал» уваходзіць у свабодную эканамічную зону, інвестарам створаны льготныя ўмовы для вядзення бізнесу. Згодна з праектам прапануюцца ўчасткі пад будаўніцтва кавярняў, аграturыстычных комплексаў, санаторыя. Можна арганізаваць сезонны харчовы аб'ект. Улады чакаюць прадпрымальнікаў, прыватны бізнес, які зможа «ажывіць» канал, стварыць камфортную зону адпачынку.

# КАЛІ «СЯБРОЎСТВА» СТАНОВІЦЦА СІНОНІМАМ «СУПРАЦЬСТАЯННЯ»

## На ваенным палігоне пад Брэстам спаборнічалі фінансісты і праграмісты

**Вольга Сойка ўдзельнічае ў ваенна-патрыятычнай спартыўнай гульні «Супрацьстаянне» трэці раз, і ўдзельнічае, як высветлілася, з задавальненнем. Яна адзіная дзяўчына ў сваёй камандзе, але ў ваенна-спартыўным майстэрстве не ўступае калегам-мужчынам. У звычайным жыцці Вольга — спецыяліст упраўлення маркетынгу банка «Масква-Мінск». А тут яна страляла, бегала, пераадольвала паласу перашкод, аказвала медыцынскую дапамогу ўмоўнаму параненаму. Спаборніцтвы прайшлі на палігоне 38-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады.**

— На гэтым палігоне праходзіць шмат спаборніцтваў, вучэнняў, у тым ліку міжнароднага ўзроўню, — сказала Вольга. — Тым большую адказнасць адчуваеш, прыязджаючы сюды. Усе мы ў жыцці сябруем са спортам. Але на такога роду мерапрыемствах ўзнікае пэўны азарт. Да таго ж, вопыт ёсць. А яшчэ — добрае надвор'е, шмат калег-аднадумцаў, з многімі сустракаемся не першы раз. Так што назву спаборніцтваў можна лічыць умоўнай.

Ваенна-патрыятычная гульня, якая адбылася ў мінулыя выхадныя пад Брэстам, называецца «Супрацьстаянне» і нечым нагадвае школьную «Зарніцу». Толькі гуляюць дарослыя людзі, таму, адпаведна, заданні даюцца больш складаныя і патрабаванні да ўдзельнікаў на парадак вышэйшыя.

Сем камандаў з Мінска, якія прадстаўляюць банкі, страхавыя кампаніі, IT-кампаніі, прыбылі ў вайсковую часць. Паводле ўмоў, кожная каманда мела пяць спартсменаў-удзельнікаў і групу падтрымкі. Апошнія, дарэчы, маглі не толькі падбадзёрваць сваіх калег гучнымі крыкамі, падносіць вадзічку спартсменам, але і ўдзельнічаць у розных спаборніцтвах і тым самым зарабляць дадатковыя балы для каманды. Так і здарылася. Асабліва вызначыліся ўдзельнікі груп падтрымкі ў блоку сілавых практыкаванняў. Напрыклад, такое спаборніцтва, як «штурханне БТРа», выклікала акрамя іншага шквал станоўчых эмоцый у гледачоў.



На здымку: Вольга СОЙКА.

Як сказаў карэспандэнту газеты **намеснік камандуючага сіламі спецыяльных аперацый па ідэалагічнай рабоце Сяргей АНДРЭЕЎ**, мэтай мерапрыемства вайскоўцы вызначылі магчымасць пазнаёміць работнікаў фінансавых структур з жыццём мабільнай брыгады, армейскімі буднямі, асаблівасцямі падрыхтоўкі дэсантнікаў. Многія з удзельнікаў не служылі ў арміі і, як аказалася, маюць даволі прыблізнае ўяўленне пра вайсковае жыццё. Таму ўмовы іх пражывання на час гульні максімальна наблізілі да рэальных. Фінансісты пасяліліся ў палатачным гарадку, харчаваліся, займаліся і выступалі ў палявых умовах.

«Такія спаборніцтвы праводзяцца ў 38-й брыгадзе трэці раз, — дадаў палкоўнік Андрэеў. — І з кожным годам адчуваецца пэўны прагрэс. Каманды прыязджаюць лепш падрыхтаваныя, расце іх калектывізм і ўзаемападтрымка».

На ўрачыстым адкрыцці гульні, якое адбылося на тэрыторыі дэсантнай брыгады, гаварылі аб патрыятычным і пазнавальным характары спаборніцтваў. З добрымі словамі пажаданняў да ўдзельнікаў звярнуўся **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў, старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валерый ГАЙДУКЕВІЧ.** Ён падкрэсліў, што ў ходзе мерапрыемстваў запланавана наведванне легендарнай Брэсцкай крэпасці, дзе беражліва захоўваецца памяць пра Вялікую Айчынную вайну, і ўсе змогуць сэрцам дакрануцца да гэтай памяці.

Асноўныя спаборніцтвы «Супрацьстаяння» прайшлі на палігоне вайсковай часці. З камандай банка «Масква-Мінск» пазнаёміў яе кіраўнік — **выканаўчы дырэктар установы Юрый БАЦЯН.** Юрый Анатолевіч падкрэсліў, што моладзь банка вельмі актыўна займаецца спортам, а пажыць у палявых умовах, пазнаёміцца з жыццём не проста вайсковай часці, а сапраўднай дэсантнай брыгады для многіх здалося асабліва цікавым. Нават паказальныя выступленні аўтаматчыкаў адразу пасля адкрыцця гульняў пакінулі незабыўнае ўражанне. Гонар банка сёлета абаранялі Яўген Цвірко, Міхаіл Норэнберг, Віктар Гецман, капітан каманды Дзяніс Расанаў і Вольга Сойка. У звычайным працоўным жыцці яны — начальнікі аддзелаў, галоўныя спецыялісты розных структур банка, а тут сталі стралкамі, кідальнікамі, бегунамі — словам, байцамі маленькага вайсковага падраздзялення. Як сказала пазней Вольга, падчас спаборніцтваў адчуваеш не толькі пэўны драйв, але і адказнасць за сваю ўстанову, з'яўляецца пачуццё каманды, таму выступаць слаба проста немагчыма. І хоць пераадольваць паласу перашкод, у тым ліку водных, кідаць гранату з акопа ў поўнай амуніцыі аказалася вельмі не проста, усе каманды справіліся з пастаўленымі задачамі з гонарам. Перамогу ў гульні сёлета заваявала каманда банка «Масква-Мінск», але насамрэч перамагло сяброўства.

Удзельнікі засталіся ўдзячныя гаспадарам за асаблівую атмасферу гэтых трох дзён. Культурная праграма прадугледжвала канцэрт, які ўсе з задавальненнем пагледзелі. У апошні, трэці дзень гульняў каманды накіраваліся на экскурсію ў Брэсцкую крэпасць. Наведалі мемарыяльны комплекс, яго музеі, а таксама гістарычны пяты форт крэпасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «СМАЧНАЕ ЛЕТА СА «ЗВЯЗДОЙ»

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Смачнае лета са "Звяздой"» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 26 мая па 30 верасня 2017 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету "Звязда" на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

### II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Набор садовай мэблі Tarifa lounge set wikbrw-std lounge, Ізраіль | 1 | 750,00 | 750,00 |
| 2 | Мангал Forester BC-781 + 6 шампураў і сумка, Кітай | 7 | 71,22 | 498,54 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» складае: — 1 248,54 (адна тысяча дзвесце сорак восем рублёў пяцьдзясят чатыры капейкі).

### III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Смачнае лета са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 26 мая па 8 ліпеня 2017 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 26 мая па 30 чэрвеня 2017 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ў установу пасля 8 ліпеня 2017 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

### IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Смачнае лета са "Звяздой"» установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела маркетынгу рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1-й катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

### V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 12 ліпеня 2017 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 мангалаў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — набор садовай мэблі.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 22 ліпеня 2017 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 22 ліпеня 2017 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

### VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2017 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 30 верасня 2017 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 верасня 2017 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

### VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3002 ад 16.05.2017 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.


## ГУК ДТП «АВТОКОМБИНАТ «ОБЛСЕЛЬСТРОЙ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Таблица №1

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Грузовой седельный тягач MAZ 5433 A2 320, рег. №АВ 8523-6 | 4284,00 |
| 2 | Грузовой седельный тягач MAZ-543302-220; рег. №ТС 01-81 | 3121,20 |
| 3 | Грузовой самосвал КАМАЗ 5511; рег. №ТМ 8889 | 1774,80 |
| 4 | Грузовой самосвал МАЗ 555102-225; рег. №ТВ2907 | 3427,20 |
| 5 | Грузовой самосвал МАЗ 555102-225; рег. №ТВ 4058 | 3427,20 |
| 6 | Грузовой самосвал МАЗ 555102-225; рег. №ТВ 4057 | 3427,20 |
| 7 | Грузовой самосвал МАЗ 555102-225; рег. №ТВ 4492 | 3916,80 |
| 8 | Грузовой самосвал МАЗ 555102-225; рег. №ТС 0182 | 3916,80 |
| 13 | Полуприцеп платформа МАЗ 93802 0-040; рег. №ТВ 3824 | 1346,40 |
| 14 | Прицеп самосвал МАЗ 857100-020; рег. №ТВ 2403 | 1346,40 |
| 15 | Прицеп самосвал МАЗ 857100-020; рег. №ТВ 2650 | 1346,40 |
| 16 | Прицеп самосвал МАЗ 857100-020; рег. №ТВ 2651 | 1346,40 |
| 17 | Прицеп самосвал МАЗ 857100-020; рег. №ТВ 2820 | 1407,60 |
| 18 | Полуприцеп платформа-панелевоз ПП1407; рег. №ТВ 2589 | 526,32 |
| 19 | Прицеп самосвал МАЗ 857100-024; рег. №ТВ 3823 | 1040,40 |
| 20 | Полуприцеп платформа-площадка ПЭ 1209; рег. №А0791 | 2142,00 |
| 21 | Полуприцеп платформа-панелевоз УПП 1212; рег. №ТА 6261; инв. №14590 | 979,20 |
| 22 | Станок токарный винтор 1А | 3427,20 |
| 23 | Полуприцеп платформа-панелевоз УПП 1212; рег. №ТА 7330 | 673,20 |
| 24 | Полуприцеп платформа-панелевоз УПП 1212; рег. №ТА 7331 | 795,60 |
| 25 | Легковой седан ГАЗ 3110 | 856,80 |
| 26 | Прицеп МАЗ 857100-026 рег. №А0090 а-6 | 1407,60 |
| 27 | Экскаватор-бульдозер ЭО2621-в-2 | 1774,80 |
| 29 | Станок обдир. шлиф. | 465,12 |
| 30 | Станок свер. верт. | 1836,00 |
| 31 | Станок Р 105 | 361,08 |
| 33 | станок в/св 271-1181 | 446,76 |
| 34 | Станок 2н-125 | 673,20 |
| 36 | Молот ковочный | 2080,80 |
| 38 | Пресс 10 шор 17575 | 208,08 |
| 41 | Принтер Phaser 3150; инв. №2833 | 43,95 |
| 42 | Персональный компьютер «Сильверадо» (комплект с принтером) | 128,52 |
| 43 | Компьютер персональный Itex | 128,52 |
| 44 | Принтер инв. №2862 | 26,29 |
| 45 | Компьютер (комплект с принтером) | 140,76 |
| 46 | Стенд 22205-01 | 373,32 |
| 47 | Пульт директорской связи | 33,51 |
| 48 | Сварочный аппарат | 52,64 |
| 49 | Телефонная станция | 208,08 |
| 50 | Электроводонагреватель | 342,72 |
| 51 | Кондиционер | 208,08 |
| 52 | Холодильник м367 | 46,95 |
| 53 | Стол бильярдный | 471,24 |
| 54 | Мойка | 612,00 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно третий раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 11.05.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 49%. Окончание приема заявлений в 11.30 07.06.2017*

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **7 июня 2017 года в 12.30** по адресу: г. Могилев, ул. Ровчакова, 14 |
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Задаток** | 10% от начальной стоимости предмета торгов |

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Изолированные помещения №700/D-115047 (площ. 99,1 м²), №700/D-89977 (площ. 17,6 м²) | 13 680,00 |
| 2 | Изолированное помещение №700/D-115048 (площ. 199,4 м²), Кран балка 2 т | 24 120,00 |
| 3 | Изолированное помещение №700/D-89971 (площ. 304,4 м²), эл. таль г/п 1 т, воздухонагреватель 1ш-6951 | 35 064,00 |
| 4 | Изолированное помещение №700/D-89973 (площ. 67,6 м²) | 7920,00 |
| 5 | Изолированное помещение №700/D-89974 (площ. 198,6 м²) | 22 080,00 |
| 6 | Изолированное помещение №700/D-89975 (площ. 407,2 м²) | 44 040,00 |
| 7 | Изолированное помещение №700/D-89976 (площ. 131,1 м²) | 14 640,00 |
| 8 | Изолированное помещение №700/D-89981 (площ. 93,6 м²) | 10 920,00 |
| 9 | Изолированное помещение №700/D-89982 (площ. 43,3 м²) | 5160,00 |
| 10 | Изолированное помещение №700/D-89983 (площ. 344,9 м²) | 37 560,00 |
| 11 | Изолированное помещение №700/D-89984 (площ. 133,9 м²), эл. таль г/п 0,5 т, эл. таль г/п 0,25 т | 17 520,00 |
| 12 | Изолированное помещение №700/D-89985 (площ. 135 м²), эл. таль г/п 1т | 17 280,00 |
| 13 | Изолированное помещение №700/D-89986 (площ. 34,2 м²), эл. таль г/п 1 т | 5328,00 |
| 14 | Изолированное помещение №700/D-89987 (площ. 404,6 м²), кран балка 2 т | 45 960,00 |
| 15 | Станок к-25 | 732,00 |
| 16 | Вентилятор и вытяжной вентилятор | 366,46 |
| 17 | Бункер с циклоном | 1440,00 |
| 18 | Жалюзи Виктория 2 шт. | 47,20 |
| 19 | Аппарат для воды нагревательный | 50,03 |
| 20 | Водонагреватель аккумуляторный | 84,00 |
| 21 | Вентилятор ST1623 | 13,02 |
| 22 | Прибор алконт С1 | 67,34 |
| 23 | Аппарат факсимильный Panasonic KX988 | 70,31 |
| 24 | Мотокоса | 60,28 |
| 25 | Лазерное МФУ Canon | 95,04 |
| 26 | Мебель (2 стола и шкаф) | 193,12 |

Лоты №№1–14 расположены на земельном участке №740100000001001517, который предоставлен для содержания и обслуживания здания на праве постоянного пользования общей площадью 0,4659 га. В отношении 57/500 доли земельного участка правообладателем выступает ОДО «Дизайнер»

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №2, проводятся впервые. Окончание приема заявлений в 11.30 26.06.2017*

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **26 июня 2017 года в 12.30** по адресу: г. Могилев, ул. Ровчакова, 14 |
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Задаток** | 10% от начальной стоимости предмета торгов |

**Место нахождения предмета торгов: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Ровчакова, д. 14.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов, +375 44 552 42 92, Андрей. Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «Фрондера», тел. +37529 395 36 35 |
| **Информация о продавце** | ГУК ДТП «Автокомбинат «Облсельстрой», Могилевская область, г. Могилев, ул. Ровчакова, д. 14 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122) |
| **Условия для участия в торгах** | До подачи заявления внести задаток на р/с 3012221557014 в ЗАО «Альфа-Банк», код банка 270, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. Также победителем подлежат возмещению затраты по организации и проведению торгов в размере 5% от начальной стоимости объекта торгов, а также затраты по размещению публикации (согласно выставленному счету).<br>4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона |

КАРАНІ І КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 2-3 (18-19)



■ Кліматычны баланс

# НАДВОР'Е ПАКАЗАЛА НОРАЎ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сёлетняя вясна была багатай на сюрпрызы надвор'я. Чаму адбываюцца ў прыродзе такія анамальныя з'явы, як снег у маі, як капрызы надвор'я адаб'юцца на ўраджаі — пра гэта нашаму карэспандэнту расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.**

## Ва ўсім вінавата глабальнае пацяпленне

Нейкіх гадоў 30 таму ўсё было проста і зразумела: у пачатку лістапада мы апраналіся ў зімовыя паліто, майскія святы сустракалі ў летніх сукенках. А за апошнія гадоў 15 можна ўспомніць сезоны, калі зімой не было патрэбы даставаць з шафы футра, затое ў сакавіку яно было неабходна.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

■ Падзея

# ЭКАНОМІКА Ў СЯБРОЎСТВЕ З ПРЫРОДАЙ

**Як аб'яднаць эканамічны рост з экалагічным дабрабытам, павысіць інвестыцыйны патэнцыял Беларусі і яе інавацыйнае развіццё — гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі ўдзельнікі XIV Рэспубліканскага экалагічнага форуму, які прайшоў у Віцебску сумесна з VI Міжнародным эканамічным форумам «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы».**

Удзел у мерапрыемстве прынялі больш за 250 дэлегатаў з розных рэгіёнаў краіны і замежжа, сярод якіх прадстаўнікі прыродаахоўных службаў, органаў дзяржаўнага кіравання, бізнесу, грамадскасці і інш.

— Кожны павінен разумець, што, развіваючы эканоміку, неабходна абавязкова ствараць для сябе спрыяльнае навакольнае асяроддзе, — сказаў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА**. — Мы разлічваем на развіццё краіны з прымяненнем інавацыйных тэхналогій, але ўсе яны павінны мець экалагічны складальнік.

Пры гэтым міністр адзначыў, што развіццё прадпрыемстваў павінна ісці разам з павышэннем узроўню іх экалагічнай бяспекі — ніякіх паслабленняў у гэтай сферы быць не можа. Удасканавальваць працэс вытворчасці, павышаць эканамічны патэнцыял прадпрыемстваў можна строга прытрымліваючыся экалагічных нормаў. І сёння над пошукам такіх варыянтаў эколагі працуюць разам з эканамістамі.

На пляцоўках форуму абмяркоўваліся і пытанні рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Менавіта яны сёння з'яўляюцца асноваЙ, на якой працуюць шматлікія беларускія прадпрыемствы. Напрыклад, на тэрыторыі Віцебскай вобласці, якая сёлета прымала форум, знаходзяцца найбуйнейшыя радовішчы глін у Еўропе. Мясцовыя азёры і рэкі багатыя на сапрапель, здабыча якога цяпер актыўна развіваецца на поўдні Беларусі. Вялікі патэнцыял выкарыстання маюць падземныя воды і залежы даламіту.

Цэнтральным мерапрыемствам двух форумаў стала спецыялізаваная выстаўка, дзе сваю прадукцыю, паслугі і найноўшыя распрацоўкі, у тым ліку і ў галіне экалогіі, прадставілі найбуйнейшыя прадпрыемствы і арганізацыі Віцебшчыны і іншых рэгіёнаў краіны.

## Нуль адходаў

ААТ «Дубровенскі льнозавод» — адно з вядучых прадпрыемстваў Беларусі па перапрацоўцы лёну. Выраблenae тут доўгае льновалакно актыўна выкарыстоўваецца на Аршанскім ільнокамбінаце, а кароткае — для патрэб будаўніцтва. Знайшлі тут прымяненне і адходам кастрыцы, якія ўтвараюцца падчас перапрацоўкі лёну і з'яўляюцца вялікай праблемай для большасці льнозаводаў краіны. Сёння кастрабрыкеты спальваюцца на шматлікіх раённых кацельнях, якія працуюць на мясцовых відах паліва, імі таксама ацяпляецца жылы фонд Дубровенскага раёна, установы аховы здароўя і адукацыі. Спецыялісты запэўніваюць, што цеплааддача кастрабрыкетаў у 1,5 раза вышэйшая, чым дрэва, гэта значыць, іх выкарыстанне больш эфектыўнае.

## Лямпачкі, здавайцеся!

ТАА «Дзямідсэрвіс» працуе ў сферы збору і абясшкоджвання адходаў вытворчасці і спажывання каля чатырох гадоў. Яго спецыялізацыя — люмінесцэнтныя лямпы, адпрацаваныя тэрмометры і іншыя прыборы, якія змяшчаюць ртуць. Дзякуючы вакуумнай тэрмадэмеркурызацыйнай устаноўцы, небяспечны метал збіраецца ў кантэйнеры-пасткі і можа выкарыстоўвацца паўторна, напрыклад, пры здабычы карысных выкапняў. Акрамя ртуці, іншыя адходы яе абясшкоджвання — шклабой, алюміній, электрычныя платы, пластмасы — таксама ўцягваюцца ў гаспадарчы зварот.

Кампанія наладзіла ўласны збор ртуцезмяшчальных адходаў ад юрыдычных асоб, а праз гандлёвыя цэнтры працуе і з фізічнымі асобамі.

## Захаваць чысціню вады

— Памяншэнне шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і насельніцтва — адна з найважнейшых задач дзейнасці ААТ «Слонімскі водаканал», — расказала **інжынер па ахове навакольнага асяроддзя Марына СУШКО.**

Для гэтых мэт на прадпрыемстве не толькі ўдасканальваюць працэс забору вады з падземных крыніц, але і мадэрнізуюць гарадскія ачышчальныя збудаванні каналізацыі. Тут таксама шукаюць шляхі выкарыстання метану і аміяку — асноўных забруджвальнікаў атмасферы на вычышчальных збудаваннях. Гэтыя шкодныя газы будуць ператварацца ў энергію на біягазавым комплексе, які плануюць усталяваць у найбліжэйшай перспектыве.

На Слонімскім водаканале часта праходзяць экскурсіі. Сюды прыязджаюць школьнікі і выхаванцы дзіцячых садоў, каб пераканацца, колькі намаганняў і працы ўкладваецца ў вытворчасць чыстай вады і ачыстку сцёкавых вод і што неабходна беражліва ставіцца да прыродных багаццяў.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*



Фота Надзеі БУЖАН.

■ Супрацоўніцтва

# ЭКАЛОГІЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ

**Першае пасяджэнне беларуска-французскай рабочай групы па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя адбылося ў Мінску**

Група дзейнічае ў рамках Пагаднення паміж Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам навакольнага асяроддзя, энергетыкі і мора Французскай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця. Дакумент быў падпісаны ў маі мінулага года ў Парыжы.



**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА** адзначыў асноўныя мэты прыродаахоўнай палітыкі нашай краіны: зніжэнне максімальна дапушчальных узроўняў антрапагеннага ўздзеяння на экасістэмы, стварэнне ўмоў для стабільнасці навакольнага асяроддзя і захавання здароўя чалавека, распрацоўку і ажыццяўленне экалагічнай палітыкі на аснове ўзгаднення экалагічных мэт з мэтамі сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Міністр падзяліўся вынікамі гэтага падыходу: індэкс экалагічнай эфектыўнасці Рэспублікі Беларусь у 2016 годзе склаў 82,3% (35-е месца са 180 краін), тады як у 2012 годзе мы займалі 65 месца з індэксам 53,9%. З 2005 года экалагічны след скараціўся амаль у два разы. За апошнія гады ў краіне адноўлена больш за 10% ад плошчы ўсіх парушаных балот. Тры асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі ўключаны ў Сусветную сетку біясферных рэзерватаў, створаную ў рамках праграмы ЮНЕСКА «Чалавек і біясфера». Частка Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» з'яўляецца аб'ектам Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. 26 водна-балотных угоддзяў уключаны ў спіс водна-балотных угоддзяў міжнароднага значэння, з іх чатыры — трансгранічныя.

Андрэй Каўхута адзначыў, што пасяджэнне — выдатны старт для развіцця беларуска-французскіх экалагічных адносін, яно прывядзе да плённага экалагічнага супрацоўніцтва па многіх напрамках.

Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі пытанні палітыкі ў сферы абыходжання з адходамі (інстытуцыянальны ўзровень, дзяржаўна-прыватныя кампаніі, прыватныя кампаніі), маніторынгу якасці атмасфернага паветра (у тым ліку выкіды парніковых газаў), зялёнай эканомікі, біяразнастайнасці і ААПТ (кіраванне ААПТ: спалучэнне эканамічнага развіцця і аховы навакольнага асяроддзя, турыстычныя інфраструктуры і экатурызм, прэзентацыя інструмента партнёрства ЕС).



**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Французскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Дзідзье КАНЭС,** які прыбыў на пасяджэнне ў складзе французскай дэлегацыі, адзначыў, што гэта новы кірунак у супрацоўніцтве нашых краін:

— Беларусь і Францыя — краіны, якія знаходзяцца на шляху ўстойлівага развіцця. У нас вялікі вопыт у перапрацоўцы і ўтылізацыі адходаў — як бытавых, так і прамысловых. У мінулым годзе быў рэалізаваны праект па вывазе і знішчэнні асабліва небяспечных адходаў з Беларусі. Сумесная праца ў напрамку аховы прыроды вельмі важная, бо прынятая канцэпцыя зялёнага развіцця мае на ўвазе эканамічны рост з мінімальнымі экалагічнымі стратамі.

Па заканчэнні пасяджэння французская дэлегацыя наведала Бярэзінскі біясферны запаведнік.

**Вольга ПРАЛЮК. Фота аўтара.** *pralyuk@zviazda.by*

# ЭКАНОМІКА Ў СЯБРОЎСТВЕ З ПРЫРОДАЙ

## «Удар» па смецці

Сёлета Брэсцкаму смеццеперапрацоўчаму заводу спаўняецца 7 гадоў. Нягледзячы на тое, што прадпрыемства пабудавана па сучаснай нямецкай тэхналогіі, з мэтай павышэння эфектыўнасці збору адходаў і іх перапрацоўкі тут прыступілі да мадэрнізацыі тэхналагічнага працэсу — у прыватнасці, укаранення аўтаматычнага сартавання.

На існуючых лініях прадпрыемства ўстанаўліваецца новае абсталяванне — аптычныя і балістычныя сепаратары. Яны будуць аўтаматычна вызначаць кожны від другасных матэрыяльных рэсурсаў і сартаваць іх па прызначэнні. Дзякуючы новаўвядзенням, на заводзе змогуць не толькі павялічыць долю здабываемых з гарадскіх адходаў другасных рэсурсаў (сёння яна складае ад 9 да 12%), але і прадухіляць назапашванне смецця ў сельскай мясцовасці (з мая прадпрыемства пачало абслугоўваць 8 сельсаветаў Брэсцкага раёна).

## Прыродзе справай дапамагаць

Правядзенне акцый прыродаахоўнай скіраванасці стала добрай традыцыяй экалагічных форумаў. Не адступілі ад яе і сёлета.

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*



Удзельнікі форума выпусцілі шырокапальцага рака ў новы «дом».

Новы зялёны сквер упрыгожыў адзін з уездаў у Віцебск каля Бешанковіцкай шашы. Удзельнікі форуму разам са студэнтамі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. П.М. Машэрава і вучнямі гімназіі №6 высадзілі на пустцы саджанцы бярозы, дуба, ліпы, клёна і рабіны — усяго тут з'явілася 140 дрэў.

На думку **намесніка начальніка аддзела Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіля КІРПІЧОНКА**, новы сквер стане упрыгажэннем горада і дапаможа палепшыць узровень азелянення абласнога цэнтра.

**настайнасці Мінпрыроды Аляксандр ГІРАЕЎ.** — Цяпер гэтаму віду нічога не пагражае, але ў наступныя два дзесяцігоддзі ён можа знікнуць з фаўны нашай краіны. Таму ў Беларусі быў распрацаваны План дзеянняў па захаванні гэтага насельніка вадаёмаў. Адным з мерапрыемстваў у рамках плана і з'яўляецца стварэнне новых папуляцый.



Усе адходы, якія застаюцца пасля абязшкоджвання ртуці, на ТАА «Дэмідсэрвіс» становяцца другаснымі рэсурсамі.



На стэндзе Мінпрыроды кожны мог праверыць якасць вады.

Фота Надзеі БУЖАН.

На іншае месца жыхарства «пераехалі» ў гэты майскі дзень і 205 асобін шыракапальцага рака. Удзельнікі форуму правялі экалагічную акцыю па падсяленні чырванакніжнага віду ў возера Асінаўскае Віцебскага раёна.

— Шыракапальцы рак мае трэці статус аховы, — расказаў **начальнік аддзела біялагічнай раз-**

Месца для правядзення акцыі было выбрана невыпадкова. Каб падсяліць рака, навукоўцы з Акадэміі навук даследавалі некалькі вадаёмаў, правялі іх гідрабіялагічную і гідрахімічную здымку, вывучылі наяўнасць магчымых драпежнікаў (напрыклад, акунёвых рыб). Менавіта Асінаўскае возера падышло па ўсіх параметрах, а значыць, існуе вялікая імавернасць, што чырванакніжнію тутэйшыя ўмовы будуць даспадобы.

**За значны ўклад у справу аховы навакольнага асяроддзя, забеспячэнне рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў Ганаровай граматай Мінпрыроды былі ўзнагароджаны гродзенскае ўнітарнае прадпрыемства электраэнергетыкі «Гроднаэнерга», ЗАТ «Атлант», вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ», прыватнае вытворчае прадпрыемства «Палімерканструкцыя».**

* * *

**Арганізатары XIV Рэспубліканская экалагічнага форуму — Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Віцебскі абласны выканаўчы камітэт, Віцебскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, унітарнае прадпрыемства «Віцебскі абласны цэнтр маркетынгу».**

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

■ Дыялог

# ЗА «ЗЯЛЁНЫМ» СТАЛОМ

## Эксперты абмеркавалі праблемы і перспектывы развіцця ў нашай краіне зялёнай эканомікі

**У рамках XIV Рэспубліканскага экалагічнага форуму ў Віцебску прайшоў круглы стол «Развіццё зялёнай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь: прынцыпы, механізмы, перспектывы». У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі прыродаахоўных службаў, органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў адукацыі, грамадскіх аб'яднанняў краіны і замежжа.**

### Сертыфікат пераваг не дае

**Намеснік дырэктара інжынерна-экалагічнага цэнтра «БЕЛІНЭКОМП» Уладзімір АДАМОВІЧ** абазначыў асноўныя праблемы, якія існуюць у сферы сертыфікацыі паслуг у галіне аховы навакольнага асяроддзя.

— Мы працуем у галіне інжынірынгавых паслуг у экалагічнай прамысловай бяспецы і ў сферы аховы працы. Наша прадпрыемства атрымала сертыфікат адпаведнасці ў ліку першых у краіне, аднак, на нашу думку, сістэма не працуе належным чынам. Сертыфікацыя не дае пераваг сертыфікаваным арганізацыям і прыродакарыстальнікам. Сёння ў краіне на рынку экалагічных паслуг працуе больш за 20 сертыфікаваных арганізацый, многія з якіх нічым не адрозніваюцца ад сваіх не сертыфікаваных канкурэнтаў.

Калі казаць аб інвентарызацыі выкідаў (акце інвентарызацыі КЗА), якія ёсць на кожным прадпрыемстве, акт узгадняецца ў камплексе з нарматывам допушчальных выкідаў, пры гэтым не патрабуюцца, як правіла, акт адбору проб і пратаколы правядзення вымярэнняў. З гэтага вынікае, што лабараторыі такіх «нядобрасумленных» арганізацый практычна не працуюць, таму што гэта патрабуе адпаведных выдаткаў.

Акрамя таго, па словах Уладзіміра Адамовіча, у 2016 годзе Беларусь засталася без метадык выканання вымярэнняў канцэнтрацый у паветры ЗР прамысловых выкідаў такіх шырока распаўсюджаных шкоднасцяў з вялікім валавым выкідам, як вуглевадароды, серавадарод, дыяксід серы. Яны былі выключаны з рэестра Мінпрыроды. Пытанне аб выкананні работ па інвентарызацыі КЗА з такімі шкоднасцямі застаецца адкрытым. БДЦА, арганізацыю, якая інспектуе лабараторную практыку, больш цікавіць фармальны бок працэсу, звязаны з афармленнем пададзеных дакументаў.

Адказнасць паміж сертыфікаванай арганізацыяй і органам па сертыфікацыі павінна быць узаемнай.

— На нашу думку, сертыфікаваныя арганізацыі павінны быць падзеленыя на некалькі катэгорый, — сказаў Уладзімір Фёдаравіч. — Напрыклад, арганізацыі першай катэгорыі ў адпаведнасці са сваім кадравым патэнцыялам і сферай акрэдытацыі лабараторый павінны быць дапушчаныя да інвентарызацыі любога буйнога прадпрыемства ў рэспубліцы.

Праверкі інспекцыйнага нагляду павінны быць комплекснымі, пачынаючы з уліку актаў адбору проб і заканчваючы гатовым актам інвентарызацыі, г. зн. працэдура з пачатку і да канца працэсу павінна быць «празрыстай», каб судзіць аб якасці выкананай працы.

Уладзімір Адамовіч прапанаваў увесці ранжыраванне сертыфікаваных арганізацый на допуск да работ у залежнасці ад іх складанасці, магчымасцяў лабараторый, а таксама ад наяўнасці адпаведнага персаналу і яго колькасці, уключыць абавязковую наяўнасць сертыфікаванай сістэмы кіравання аховай працы па СТБ 18001 для арганізацый першай катэгорыі, вызначыць вектар і парадак правядзення інспекцыйнага нагляду за сертыфікаванай арганізацыяй, увесці крытэрыі для адклікання сертыфіката, зрабіць усе даныя публічнымі.

— Хацелася б, каб за высокімі словамі аб развіцці экалагічнай свядомасці грамадства, аб новых прыродаахоўных тэхналогіях, аб жорсткім кантролі дзейнасці прадпрыемстваў па вытворчасці экалагічна чыстай прадукцыі сталі канкрэтныя справы, а за дэкларацыяй еўрапейскіх прынцыпаў былі відаць добра прадуманыя дзеянні, — адзначыў ён.

### Як актывізаваць беларускі веларух?

**Антон РАДНЯНКОЎ, прадстаўнік фонду «Інтэракцыя»,** расказаў аб выніках праекта «Устойлівая гарадская мабільнасць», які дазволіў палепшыць транспартную сістэму, бяспеку і экалагічную сітуацыю ў Полацку.

Актывістамі фонду былі распрацаваны План устойлівай гарадской мабільнасці і рэкамендацыі па яго рэалізацыі, арганізавана першая веладарожка ў горадзе, выдадзены дапаможнік па прыцягненні насельніцтва ў веласіпедны рух. Таксама стваральнікам удалося запусціць праграму для смартфонаў па планаванні паездак на грамадскім транспарце. Быў праведзены Еўрапейскі тыдзень мабільнасці і іншыя інфармацыйныя кампаніі.

### Экамаркіроўка

**Валерый КУРЫЛАЎ, дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Экалогіяінвест»,** звярнуў увагу на стан і перспектывы развіцця экалагічнай маркіроўкі ў нашай краіне.

— Экалагічная маркіроўка прымяняецца для стымулявання ўздзеяння рынку на паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя — прадухіленне забруджвання апошняга пры вытворчасці, выкарыстанні, а таксама пры перапрацоўцы прадукцыі і ўпакоўкі, якія страцілі свае ўласцівасці. Падобная маркіроўка неабходная, паколькі яе прымяненне дазваляць паменшыць колькасць адходаў, што накіроўваюцца на захаванне, і перанакіраваць іх на выкарыстанне. З дапамогай інфармацыі аб адпаведнасці прадукцыі павышаным экалагічным патрабаванням яна таксама будзе садзейнічаць актывізацыі экспарту і павышэнню канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Праблемы ўкаранення экалагічнай маркіроўкі ў цяперашні час заключаюцца ў адсутнасці зацікаўленасці кіраўнікоў прадпрыемстваў, выразнага разумення вытворцамі і прадаўцамі прадукцыі прынцыпаў экалагічнай маркіроўкі, а таксама ў адсутнасці комплекснай нарматыўнай базы.

### Адукацыйны аспект

**Загадчык кафедры нацыянальнай эканомікі і дзяржаўнага кіравання БДЭУ, доктар эканамічных навук, прафесар Алена ДОРЫНА** лічыць, што для паспяховай рэалізацыі ў Беларусі прынцыпаў і механізмаў зялёнай эканомікі неабходна падрыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры, якія будуць валодаць неабходнымі ведамі, навыкамі і ўменнямі ў галіне зялёнай эканомікі. Для гэтага выкладчыкамі БДЭУ была распрацавана і ўкаранёна ў навучальны працэс новая дысцыпліна «Кіраванне зялёным развіццём нацыянальнай эканомікі». Прадмет вывучае сукупнасць сутнасных характарыстык, прынцыпаў, інструментаў, метадаў і механізмаў кіравання зялёным развіццём нацыянальнай эканомікі з улікам назапашанага вопыту найлепшых замежных практык у гэтай галіне, а таксама ўлічвае нацыянальныя асаблівасці, умовы і фактары, якія могуць стрымаць гэтае развіццё.

Усе выступоўцы на круглым стале аб'ядноўвала агульная ідэя абароны прыроды. Спікеры былі аднадушныя ў тым, што кіраўнікі не маюць права на бяздзейнасць і памылкі ў прыродаахоўнай чыннасці, бо прырода — адно з галоўных нашых багаццяў. І яе трэба не проста захоўваць, а ачысціць ад вынікаў непрадуманай варварскай дзейнасці, якой яна падвяргалася ў апошнія дзесяцігоддзі.

**Вольга ПРАЛЮК.**
*pralyuk@zviazda.by*

# НАДВОР'Е ПАКАЗАЛА НОРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*



Што адбываецца з кліматам, чаму здараюцца нетыповыя з'явы ў прыродзе, расказала **начальнік аддзела клімату Гідрамета Алена КАМАРОЎСКАЯ**:

— Змены клімату абумоўлены глабальным пацяпленнем. У Беларусі яно пачалося ў 1989 годзе і цяпер працягваецца. За гэты час сярэдняя гадавая тэмпература вырасла на 1,3 °С. Усе гэтыя гады, за выключэннем 1996 года, былі цяплейшыя за кліматычную норму, якая для Беларусі складае 5,8 °С. Таксама павялічылася кантраснасць надвор'я: то горача, то холадна. Мяркуецца далейшы рост тэмпературы, а разам з ім і высокая імавернасць анамальных з'яў.

***— Як часта на тэрыторыі Беларусі выпадаў снег у маі?***

— Нагадаю, што на тэрыторыі нашай краіны ў норме канчатковае снежнае пакрыва сыходзіць у сярэднім у першай дэкадзе красавіка. Аднак зарэгістравання і выпадкі майскага снегападу. Так, напрыклад, у Мінску ў 1945 годзе снег выпаў 26 мая. У 1952 годзе вялікі снег выпаў 19 мая, і вышыня снежнага покрыва дасягала 6 см. Ён праляжаў два дні і прычыніў шмат шкоды сельскай гаспадарцы. Самы позні выпадак снегападу назіраўся 6 чэрвеня 1962 года — тады снег праляжаў больш за дзве гадзіны. Думаю, шмат хто з мінчан памятае 1 мая 2007 года, калі снег ішоў на працягу 9 гадзін і ўтварыў снежнае покрыва вышынёй 3 см.

У гэтым годзе снег назіраўся 1 і 10—11 мая ў Езярышчы, Сянне, Оршы, Горках, Барысаве, Валожыне, Ашмянах і Лідзе.

***— З пункту гледжання абывацеля вясна ў гэтым годзе нейкая няўдалая, халодная. А якая ваша ацэнка?***

— Вясна ў цэлым з 1 сакавіка па 13 мая не халодная, але вельмі кантрасная. Пачалася вясна на месяц раней, чым звычайна (17—18 лютага), з пераходам сярэднясутачнай тэмпературы паветра праз 0 °С. Першая палова вясны характарызавалася як цёплая, у прыватнасці, тэмпература паветра ў сакавіку была амаль на 6 °С вышэйшай за кліматычную норму. І тэмпература красавіка таксама была вышэйшай за норму на 0,5 °С. Аднак па тэмпературным рэжыме месяц аказаўся неаднародным: першая палова была цёплай, затым рэзка пахаладала. Такое надвор'е пратрымалася месяц, і гэты перыяд сапраўды вельмі халодны: тэмпература паветра была на 2—3,5 °С ніжэйшай за норму. Так холадна ў перыяд з 15 красавіка да 11 мая на большай частцы тэрыторыі краіны яшчэ ні разу не было за ўвесь пасляваенны перыяд.

## Разлікі на ўраджай

Халоднае і нестабільнае надвор'е ў красавіку і ў маі выклікае трывогу: што будзе з ураджаем? Пра гэта думаюць гаспадары прыватных падворкаў і кіраўнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

— Ад замаразкаў пацерпіць ураджай костачкавых і яблыкаў, у першую чаргу ў паўднёвых рэгіёнах краіны. Там ужо ў красавіку квітнелі абрыкосы і алыча — ім пашкодзілі яшчэ красавіцкія замаразкі. У цэнтральным і паўночным рэгіёнах у фруктовых дрэў напярэдадні майскіх халадоў толькі пачыналася цвіценне, і таму замаразкі паўплывалі на іх у меншай ступені, — кажа **намеснік начальніка службы гідралогіі і аграметэаралогіі Гідрамета Надзея МЕЛЬЧАКОВА**. — Аднак і тут маюць месца частковыя пашкоджанні кветак чарэшні, вішні, ранніх сартоў і грушы, пашкоджаны першыя кветкі ў ранніх суніц.



Фота БЕЛТА.

Што датычыцца азімых, то можна казаць пра тое, што ў прыродзе ўсё мудра ўладкавана. У сілу ўмоў, якія склаліся мінулай восенню, у многіх раёнах азімыя сышлі ў снег, не атрымаўшы дастатковага развіцця. Зацяжная вясна дала ім магчымасць падоўжыць перыяд кушчэння, з'явіліся дадатковыя парасткі, і ёсць падставы чакаць добры ўраджай. Нягледзячы на нестабільнае надвор'е, большасць раёнаў правялі сяўбу ранніх збожжавых культур у аптымальныя тэрміны. Аднак у паўночным рэгіёне Беларусі ўмовы для пасяўной у гэтым годзе склаліся вельмі неспрыяльна. На большай тэрыторыі Віцебскай вобласці да пачатку другой дэкады мая глеба заставалася ў асноўным вільготнай звыш нормы. Лішак глебавай вільгаці перыядычна ўскладняў палявыя работы і ў іншых рэгіёнах. Выключэнне складае, мабыць, толькі Гомельская вобласць: на крайнім паўднёвым усходзе ўжо прыкметны недабор ападкаў.

Халодная вясна вымусіла сельскагаспадарчыя прадпрыемствы перанесці пасадку цеплалюбівых раслін (бульбы, кукурузы) на больш позні перыяд. Нізкія тэмпературы не спрыяюць догляду раслін, засваенне мінеральных угнаенняў, напрыклад, у такіх умовах ідзе горш.

Дэфіцыт цяпла, перапады начных і дзённых тэмператур стрымлівалі адрастанне і назапашванне вегетатыўнай масы шматгадовых траў. Нягледзячы на пацяпленне, па начах па-ранейшаму халаднавата, што не вельмі спрыяе росту траў. Пры гэтым тэрміны першага ўкосу ўжо набліжаюцца. У трэцяй дэкадзе мая ранняя сарты травы ў паўднёвым рэгіёне краіны пачнуць пасляваць для касавіцы. З-за пагодных анамалій першы ўкос, хутчэй за ўсё, будзе больш сціплы, чым у мінулым годзе. Нягледзячы на ўсе гэтыя моманты, ёсць падставы казаць пра тое, што катастрафічных наступстваў з-за вясновай нестабільнасці надвор'я не прадбачыцца. Наколькі багатым будзе ўраджай, цяпер ужо залежыць ад летняга надвор'я: засуха або залішняя вільгаць, як вядома, мае негатыўныя наступствы.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
*yanovskaya@zviazda.by*

### Аграклiматычныя зоны змяняюць межы

**Пацяпленне клімату прывяло да таго, што адбыліся змены меж агракліматычных зон на тэрыторыі Беларусі. Упершыню схема агракліматычнага раянавання Беларусі была складзена ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. На тэрыторыі нашай краіны спецыялісты выдзелілі тры агракліматычныя зоны: Паўночную, Цэнтральную і Паўднёвую, якія займалі прыкладна аднолькавыя плошчы.**

**За апошнія 28 гадоў у выніку пацяплення агракліматычныя зоны ссунуліся прыкладна на 200 км на поўнач. Паўночная агракліматычная зона практычна распалася, затое на поўдні з'явілася новая, падобная па клімаце з паўночнымі рэгіёнамі Украіны.**

■ У свеце раслін

# ЧАРАМША НА СВАІМ АГАРОДЗЕ

**«Купляйце чарамшу!» — з такім заклікам звяртаюцца пажылыя жанчыны, якія гандлююць звычайна на стыхійных рынках. І людзі актыўна купляюць гэты вясновы далікатэс, нягледзячы на тое, што расліна ўнесена ў Чырвоную кнігу. Між тым чарамшу можна вырошчваць на ўласных агародах.**



## ІНГРЭДЫЕНТ ДЛЯ САЛАТАЎ

У народзе чарамшу называюць дзікім часнаком, або мядзведжай цыбуляй. Яе лісце падобнае на ландыш (які, дарэчы, атрутны), а смак жа яна нагадвае цыбулю, а пах расліна мае часночны, але толькі ўсё гэта ў вельмі лёгкай канцэнтрацыі. Да таго ж чарамша — нізкакаларыйны прадукт, і ўсё гэта робіць яе найлепшым інгрэдыентам для вясновых салатаў.

У чарамшы змяшчаецца цэлы комплекс розных вітамінаў: А, тыямін (В1), рыбафлавін (В2), пірыдаксін (В6), фоліевая кіслата (В9), вітамін С, ніяцын і ніяцынавы эквівалент (РР).

### КАМУ НЕЛЬГА ЎЖЫВАЦЬ ЧАРАМШУ

**Здароваму чалавеку лекары раяць ужываць на дзень не больш за 20 лістоў гэтай расліны сярэдняга памеру. Калі не ўлічваць дазіроўку, можа ўзнікнуць бяссонніца, парушыцца функцыя сэрца, сасудаў. Настойку чарамшы нельга ўжываць падчас цяжарнасці, у лактацыйны перыяд. Пры страўнікавых захворваннях, гепатыце, панкрэатыце і эпілепсіі чарамшу рэкамендуецца выключыць з рацыёну.**

## ЧЫРВАНАКНІЖНІЦА

У Беларусі чарамша ўнесена ў Чырвоную кнігу з 1964 года. Вось як гэта абгрунтоўваецца: «З-за гістарычных фактараў, а таксама пад уплывам гаспадарчай дзейнасці чалавека месцаў, прыдатных для існавання папуляцый гэтай расліны, у Беларусі няшмат. Значны адмоўны ўплыў на ўстойлівасць і прадукцыйнасць папуляцый аказвае зрэзка лісця і вытоптванне ў працэсе нарыхтовак у якасці харчовай і лекавай сыравіны. У апошнія дзесяцігоддзі некалькі папуляцый, якія знаходзіліся паблізу населеных пунктаў, зніклі (наваколлі в. Папялёва Пружанскага р-на Брэсцкай вобл., Чыгуначнай станцыі «Энергетык» Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. і інш.). Колькасць раслін у іншых рэгіёнах знізілася ў сувязі з нерэгуляваным зборам насельніцтвам і вытоптваннем».

Акрамя нашай краіны, пад дзяржаўнай аховай чарамша знаходзіцца ў Літве, Латвіі, Смаленскай вобласці Расіі і Украіне.

На думку **начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалая СВІДЗІНСКАГА**, калі людзі перастануць купляць чарамшу ў вулічных гандляроў, тыя будуць вымушаны спыніць несанкцыянаваны збор расліны.

**Збор рэдкіх раслін, уключаных у Чырвоную кнігу Беларусі, забаронены і караецца штрафнымі санкцыямі на грамадзяніна ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь (арт. 15.8. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях), што сёння складае ад 460 да 1150 беларускіх рублёў.**

## МЯДЗВЕДЖАЯ ЦЫБУЛЯ НА СВАЁЙ ГРАДЦЫ

Чарамшу можна пасадзіць на сваім прысядзібным участку. Вядома, на гэта спатрэбіцца больш сіл і часу, чым купіць зялёны пучок за рубель, а то і 50 капеек. Аднак давайце думаць пра прыроду і пра тое, што будзе на зямлі пасля нас. Улічваючы натуральныя ўмовы росту чарамшы, лепш за ўсё саджаць яе на зацененых участках. Для гэтага цалкам прыдатнае месца пад пладовымі дрэвамі і хмызнякамі. Расліна любіць слабакіслую, добра дрэнажаваную глебу. Пры гэтым яна павінна быць рыхлай і вільготнай. Дапускаецца выкарыстанне тарфянікаў. На прысядзібным участку вырошчваць чарамшу можна насеннем ці расадай.

## ВЫРОШЧВАННЕ НАСЕННЕМ

Набытае насенне неабходна стратыфікаваць. Для гэтага яго кладуць у вільготны рачны пясок і ставяць на ніжнюю паліцу халадзільніка. Можна змясціць і ў іншым халаднаватым месцы з тэмпературай ад 0 да -3 °С. Праз прыкладна 100 дзён насенне можна высейваць у адкрыты грунт. Да моманту пасадкі трэба падрыхтаваць градку: глеба павінна мець рыхлы склад, дастатковую вільготнасць і, вядома, быць урадлівай.

Пры перакопцы ўносяцца наступныя варыянты ўгнаенняў (з разліку на 1 м²):

— толькі арганіка: вядро ліставога перагною;

— камбінаванае: вядро перагною, 15 г салетры аміячнай, 15—20 г калійнай солі і 30—40 г суперфасфату.

Далей на градцы вызначаюцца баразёнкі для высаджвання насення чарамшы. Адлегласць паміж разоркамі павінна складаць каля 20 см, а паміж раслінамі ў шэрагу — каля 15 см. Пры такой пасадцы ўдасца атрымаць каля 75 кусцікаў мядзведжай цыбулі на 1 м².

Пасля таго як усё насенне будзе раўнамерна размеркавана, яго прысыпаюць рыхлай, лёгкай глебай і прыкачваюць. Сеянцы чарамшы патрабуюць рыхлення глебы, якое неабходна рабіць вельмі акуратна. Таксама спатрэбіцца ўнясенне арганічных угнаенняў.

## ВЫРОШЧВАННЕ РАСАДАЙ

Гэты спосаб больш складаны. Як і першы, ён патрабуе стратыфікацыі насення для лепшай яго ўсходжасці. Але гэты працэс займае ўсяго чатыры тыдні, на працягу якіх намочанае насенне захоўваюць у халадзільніку. За гэты час яно паспявае прарасці, што дазваляе адбракаваць дрэнны матэрыял. Сеянцы чарамшы лепш за ўсё змясціць у тарфяныя збанкі, напоўненыя рыхлым глебагрунтам. Да моманту высадкі на градку расліны варта трымаць у светлым памяшканні пры тэмпературы 18 °С, не забываючыся перыядычна паліваць. Увесну, калі глеба досыць прагрэецца, надыходзіць пара высадкі расады. Градка рыхтуецца па аналогіі з папярэднім спосабам пасадкі. Выкарыстанне тарфяных гаршчочкаў дасць магчымасць на некаторы час забыцца пра праполку пустазелля. У далейшым пры вырошчванні чарамшы ўжываюцца рыхленне град, умераны паліў і мульчыраванне глебы.

## УБОРКА І ЗАХОЎВАННЕ

Лісце чарамшы збіраюць да цвіцення, а насенне — пасля пацямнення каробачак. Свежае лісце добра захоўваецца на працягу некалькіх дзён, калі яго палажыць у халадзільнік. Для больш працяглага захоўвання лісце мыюць, высушваюць, дробна рэжуць і замарожваюць у поліэтыленавых пакетах. У такім выглядзе чарамша захоўвае свае спажывецкія якасці больш за год. Лячэбныя ўласцівасці чарамшы прыкладна такія ж, як і часнаку. Лісце і хвосцікі дадаюць у салаты і супы, у начынку для пірагоў. Акрамя таго, дробна нарэзанае або тоўчанае лісце і цыбуліны чарамшы добра захоўваюць мяса, не даючы яму хутка псавацца.

**Віялета КРАСАЎКІНА**

Разам з прыродай

# ЗВОНКІ СЛУЦКІ САЛАВЕЙ ЗАПРАШАЕ Ў СВОЙ МУЗЕЙ



У зацені двухсотгадовага дуба пасвяцца чарапахі — такое можна ўбачыць у двары Слуцкага эколага-біялагічнага цэнтра навучэнцаў.

**Адзіны ў Беларусі слуцкі Музей салаўя з цікавасцю наведваюць мясцовыя аматары прыроды і госці старажытнага горада.**

Гэтым разам сюды прыехала каманда прафесіяналаў: Слуцкі эколага-біялагічны цэнтр навучэнцаў стаў месцам правядзення абласнога семінара «Вопыт і перспектывы развіцця музеяў прыроды Мінскай вобласці». Яго ўдзельнікі абмеркавалі планы стварэння новых экспазіцый, з цікавасцю праслухалі паведамленне пра тое, як настаўнікі і вучні гімназіі горада Дзяржынска збіраюць матэрыялы для свайго музея савы. Мудрая, разважлівая птушка стала своеасаблівым сімвалам




Экскурсію праводзіць дырэктар Слуцкага эколага-біялагічнага цэнтра навучэнцаў Тамара КАЛЯДА.



Сярод музейных «партрэтаў» слуцкага салаўя ёсць і такі: выкаваны майстрам-кавалём.



Пра глабальныя перамены ў навакольным асяроддзі розных кантынентаў расказвае прафесар з Сербіі Крсціч БАРЫВОЙ.

гімназіі. Пра яе тут ведаюць шмат паданняў, вершаў. Дазналіся вучні і пра ўмовы пражывання савы ў мясцовых лясах.

Уплыў сучасных вялікіх гарадоў на стан навакольнага асяроддзя вывучаюць школьнікі і педагогі Салігорскага эколага-біялагічнага цэнтра дзяцей і моладзі. На створанай імі інтэрактыўнай «Сцежцы развіцця адчування» можна ўбачыць больш за восемсот відаў і сартоў раслін, пачуць багатыя сваёй разнастайнасцю гукі прыроды, пазнаць навобмацак тыя раслінкі, глебу, якія дзецям у горадзе не сустракаюцца.

Менавіта пра тое, што чалавецтва пакідае ў спадчыну падрастаючаму пакаленню, з хваляваннем гаварыў удзельнік семінара прафесар Крсціч Барывой з Сербіі. Вядомы эколаг прааналізаваў глабальныя працэсы і фактары пагрозы стану навакольнага асяроддзя. Згаджаючыся з беларускімі калегамі, ён падкрэсліў, што экалагічная адукацыя дзятвы не меней значная, чым укараненне сучасных прыродаахоўных тэхналогій.

Дарэчы, пра ідэі сучасных вынаходак, запазычаных чалавекам у птушак, раслін, звяроў, таксама расказвалі стваральнікі музеяў прыроды. З вёскі Гацкі Слуцкага раёна на семінар прывезлі цікавую прэзентацыю пра нанатэхналогіі XXI стагоддзя і іх сувязі са звычайнымі... матылькамі. Унікальная навігацыйная сістэма некаторых відаў гэтых насякомых дае ім магчымасць, не збіваючыся з курсу, праляцаць тысячы кіламетраў. Пабудова пяшчотных крыльцаў матылькоў падказала вырашэнне многіх задач распрацоўшчыкам сонечных батарэй, воданепрымальных тканін, манітораў...

Несумненна, школьнікі з вёскі Гацкі, азнаёмленыя з фантастычнымі здольнасцямі матылёў, яшчэ з большай павагай ставяцца да насельнікаў мясцовых лясоў і палёў.

Што ж датычыцца слуцкага салаўя, то яго чароўныя здольнасці агульнавядомыя. Нездарма гэтаму ўнікальнаму спеваку мясцовых гаёў і ўзлескаў прысвечаная экспазіцыя музея. У ім сабраныя малюнкі, фотаздымкі, гуказапісы, вырабы ўмельцаў, памятныя манеты, мастацкая літаратура. Ёсць тут нават даследаванне прозвішчаў, утвораных калісьці ад слова «салавей».

Слуцкі Музей салаўя — сённяшні ўзор паспяховага ўкаранення новых формаў экалагічнага выхавання. Але ў тым і прызначэнне яго, каб любога добрага ўзору, каб яго пераймалі і развівалі далей.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара**

# КУЛІКОВЫ «ЗАРУЧЫНЫ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Небывалае мноства птушак на Тураўскім лузе падахвоціла маладых арнітолагаў і ў тым ліку навуковага супрацоўніка айчыннай Акадэміі навук Паўла Пінчука набыць невялікі дом на ўскраіне Турава і арганізаваць у ім палявы арніталагічны стацыянар. За час існавання станцыі было акальцавана амаль 40 тысяч кулікоў — чыбісаў, траўнікаў, вялікіх вераценнікаў, куліkoў-сарок, зуйкоў, марадункаў, фіфі і іншых птушак. Сёлета, за месяц з невялікім, беларускія арнітолагі ўзялі на ўлік больш за 700 птушак, адных толькі баталёнаў — болей за паўтысячы. Цяпер разам з арнітолагам працуюць некалькі памочнікаў-добраахвотнікаў. Працы хапае ўсім. Пасткі для птушак пастаўлены ў розных месцах па залітым паводкай беразе Прыпяці і іх неабходна правяраць кожныя дзве гадзіны. За палявы сезон у Тураве працуюць дваццаць валанцёраў.

Заказнік "Тураўскі луг" з'яўляецца унікальным птушыным рэзерватам у Еўропе.







Дзевяноста працэнтаў тэрыторыі заказніка затоплена вясновай паводкаю. На выспах збіраюцца сотні тысяч птушак. У Тураў едуць прадстаўнікі навуковых колаў і простыя назіральнікі (бёрдвотчары) з Вялікабрытаніі, Польшчы, Германіі, Францыі, Галандыі, Расіі, Украіны, Прыбалтыкі, і вядома, з нашай краіны. Усіх іх аб'ядноўвае інтарэс да маленькіх куліkоў.

Станцыя — гучна сказана, бо месціцца ў старой пасляваенай хаце і зусім не нагадвае сучасную лабараторыю альбо навуковы цэнтр. Двор станцыі ў нечым падобны на падворак рыбака: на вяроўках вісяць сеткі, да сцяны паветкі прыстаўлены вёслы, на парозе сушацца боты-балотнікі, а за агароджай на беразе старога рэчышча сохнуць лодкі. І толькі дзве пазнакі сведчаць, што сядзіба мае дачыненне да арніталогіі: на веснічках намаляваны абрыс птушкі, а ў акне ролю фіранак выконваюць кардонкі з выявамі куліkоў.

— Мы працуем у палявых умовах і ўсё, што для работы нам патрэбна, — маем, — кажа кіраўнік станцыі і гаспадар сядзібы Павел Пінчук. — Пасткі для адлову, лодкі, каб трапіць на птушыныя астраў, інструменты для кальцавання. У доме ёсць і мінімальныя бытавыя ўмовы — ложкі для адпачынку, душ, газавая пліта і нават печ. Маніторынг вядзецца круглыя суткі, і мы павінны быць заўсёды ў працоўнай форме.

Святая святых на станцыі — стол для кальцавання, ён знаходзіцца ў верандзе. На ім ляжаць пласкагубцы, лінейка, штангенцыркуль і мініяцюрная электронная вага. І шмат кольцаў — пластмасавых і алюмініевых, з маркіроўкамі і розных па колеры. Асноўныя аперацыі па кальцаванні праходзяць менавіта тут. Злоўленую птушку вязуць на станцыю ў баваўняным мяшэчку. Перад тым як кальцаваць, птушку аглядаюць, мераюць дзюбу штангенцыркулем, а крыльцы — лінейкай, узважваюць і тады прымацоўваюць кольца на лапцы. Надзяваюць і па два кольцы, нават і па тры. Колькасць кольцаў залежыць не толькі ад віду куліка, але і ад яго рэдкасці. Усе замеры заносяцца ў спецыяльны журнал, кожнай птушцы прысвойваецца асабісты нумар, па якім можна лёгка даведацца, з якой краіны яна прыляцела.

— У мінулым годзе мы злавілі марадунку, якой было 17 гадоў, а сёлета ў пастку трапіў кулік-траўнік, якога мы ж і кальцавалі ў 2011-м, — кажа Павел Пінчук. — На пачатку вясны мы злавілі і акальцавалі куліка фіфі, узважылі, запісалі замеры ў журнал. Праз пару тыдняў зноў злавілі гэтую птушку і зноў узважылі і аказалася, што за гэты час кулік прыбавіў у вазе яшчэ на 50 грамаў. Гэта было для нас пацвярджэннем, што Тураўскі луг з'яўляецца важнай кармавой базай для куліkоў у нябліжэйшым шляху да месца гнездавання.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Жыткавіцкі раён.*

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Кривичское РТП», Минская обл., Мядельский р-н, г. п. Кривичи, ул. К. Маркса, 10 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Здание магазина** | Здание специализированное розничной торговли | 106,1 кв. м | 633/С-13414 | Минская обл., Мядельский р-н, Нарочский с/с, д. Швакшты, д. 1А |
| **Составные части и принадлежности** | кирпичная пристройка, дощатый сарай, уборная | | | |

**Сведения о земельном участке**: предоставлен Продавцу пл. 0,0366 га на праве аренды сроком по 23.01.2113 для обслуживания здания магазина

**Начальная цена с НДС 20% – 15 000 бел. руб. 00 коп.**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете **«Звязда» от 10.03.2017**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **07.06.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **05.06.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ООО «Юридическая компания «Приоритет», г. Полоцк, ул. Нижнепокровская, 41 Б, пом. 26. **Продавец**: торгово-производственное унитарное предприятие «Торговый дом «Коптево», г. Новополоцк, пер. Рижский, 10.

**Предмет аукциона:** плиты из минеральной ваты на синтетическом связующем тепло- и звукоизоляционные. **Место нахождения –** Витебская обл., г. Новополоцк, пер. Рижский, д. 10.

**Начальная цена с НДС 20% – 20 439 руб. 63 коп. Шаг аукциона – 1021 руб. 98 коп.**

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Ответственное лицо: Михайлов Сергей Валерьевич, контактный телефон МТС +375 33 3805012.

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с 3012675380018 в ЦБУ ЗАО «Банк «Решение» №02/01 г. Витебск, БИК 153001288, получатель платежа – ООО «Юридическая компания «Приоритет», УНП 391609018.

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дня после проведения аукциона. **Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СМ РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». В случае признания торгов **несостоявшимися** в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%. **Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов. **Организатор** аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Предыдущее** извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.04.2017.

**Аукцион состоится:** 05.06.2017 в 11.00 по адресу: 211415, г. Полоцк, ул. Нижнепокровская, д. 41Б, пом. 26. **Дата и время окончания приема документов:** 02.06.2017 до 17.00 по указанному адресу.

**E-mail: yur_k_prioritet@mail.ru. Тел.: +375 0214 46 25 89; +375 29 2314901**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

### о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | Лот №1 – легковой специальный джип ШЕВРОЛЕ НИВА, год выпуска – 2005, цвет – бордовый, регистрационный знак 7480 AI-2, начальная цена – 4 200,00 белорусских рублей.<br>Лот № 2 – грузовой бортовой тентовый ГАЗ 33023, год выпуска – 2004, цвет – белый, регистрационный знак ВА 8591, начальная цена – 2 300,00 белорусских рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Электромонтажник-38» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, г. Полоцк, ул. Суворова, 61 |
| **Обременения** | Обременений нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 14<br>07.06.2017 в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка: 211400, г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 14 (opi_polotsk@mail.ru).<br>Зам. начальника отдела принудительного исполнения Полоцкого района г. Полоцка – Казакова Жанна Васильевна, г. Полоцк, ул. Успенская, 2, тел.: 80214 44 25 13, 8 033 687 90 33 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 06.05.2017 на счет отдела принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка р/с 3642903000517, ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 216, г. Полоцк, код 648, УНП 300002505.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

Управляющий ООО «Аврора-тур» (дело №953-13Б/2016, УНП 191763730) ООО «Правовая компания «АльтЮрКом» сообщает, что собрание кредиторов по защите требований ООО «Мир в кармане» состоится 12.06.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 11а, оф. Б-804. Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по вышеуказанному адресу, согласовав время с управляющим по тел. 8 017 278-43-56.

УНП 191343750

# Дэмаграфія: вучымся ўплываць

**Каля 40 спецыялістаў у галіне дэмаграфіі (прадстаўнікоў міністэрстваў аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны, эканомікі, выканаўчай улады розных узроўняў) пройдуць у Мінску курс павышэння кваліфікацыі «Асновы дэмаграфіі для дзяржаўных служачых».**

На старце курса **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Аляксандр РУМАК** заўважыў, што дэмаграфічныя працэсы ў еўрапейскіх краінах у цэлым падобныя, а самым важным з'яўляецца тое, што на іх можна і неабходна ўплываць. Шэраг прынятых у папярэднія гады мер дазваляе гаварыць сёння хоць і пра невялікія, але станоўчыя зрухі, сярод якіх — рост колькасці насельніцтва. Аднак у рэпрадуктыўны ўзрост уступае малалікае пакаленне 1990-х, і тут таксама неабходна адшукаць спосабы станоўчага ўплыву на бязрадасную сітуацыю.

На працягу многіх гадоў курс па дэмаграфіі быў праведзены амаль у 20 краінах Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі. Сёлета ён праводзіцца спецыяльна для беларускіх спецыялістаў з удзелам найлепшых экспертаў як самой Беларусі, так і Расіі, і некаторых міжнародных ВНУ, даследчых цэнтраў — Белдзяржуніверсітэта, Цэнтра сацыяльна-дэмаграфічных даследаванняў НДІ працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Інстытута дэмаграфіі Нацыянальнага даследчага ўніверсітэта (Расія), Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава, Санкт-Пецярбургскага эканоміка-матэматычнага інстытута РАН, Еўрапейскага цэнтра палітыкі і даследаванняў па пытаннях сацыяльнага дабрабыту (Аўстрыя), Карлава ўніверсітэта (Чэхія) і іншых.

Паводле слоў **намесніка прадстаўніка ЮНФПА ў Рэспубліцы Беларусь Алены КАСЬКО**, неабходна выкарыстоўваць багаты тэарэтычны патэнцыял у галіне палітыкі дэмаграфічнай бяспекі. Пры падтрымцы расійскага боку спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны працягваюць распрацоўваць маніторынгавую сістэму ацэнкі эфектыўнасці праграм дэмаграфічнай бяспекі ў краіне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*protas@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | ППЦ 96221-03 САТ110, гос. номер А 1518 А-4, 2006 г. в. (полуприцеп специальный, цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 24 м куб., цвет – оранжевый, разрешенная масса – 42 000 кг). |
| **Начальная цена продажи** | 9 129,73 р. (девять тысяч сто двадцать девять рублей семьдесят три копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 913 р. (девятьсот тринадцать рублей) |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | МАЗ-9919 00-012 ППЦ-22, гос. номер А 0682 А-4, 2005 г.в. (полуприцеп специальный, цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м куб., цвет – оранжевый, разрешенная масса – 36 000 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 10 720,51 р. (десять тысяч семьсот двадцать рублей пятьдесят одна копейка) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1072 р. (одна тысяча семьдесят два рубля) |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | MAZ 5440 19, гос. номер АА 9911-4, 2009 г. в. (Грузовой двухосный седельный тягач, цвет – зеленый, разрешенная масса – 18 750 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 12 878,23 р. (двенадцать тысяч восемьсот семьдесят восемь рублей двадцать три копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1288 р. (одна тысяча двести восемьдесят восемь рублей) |
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | MAZ 5440 А8 360-031, гос. номер АВ 5023-4, 2009 г. в. (грузовой двухосный седельный тягач, цвет – синий, допустимая масса – 18 750 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 12 098,96 р. (двенадцать тысяч девяносто восемь рублей девяносто шесть копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1210 р. (одна тысяча двести десять рублей) |
| **ЛОТ 5** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | ППЦ Т-20, гос. номер АВ 5023-4, 2005 г.в. (полуприцеп цистерна для перевозки сжиженного газа на 2-осном шасси, цвет – серебристый, разрешенная масса – 19 760 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 7 428,37 р. (семь тысяч четыреста двадцать восемь рублей тридцать семь копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 743 р. (семьсот сорок три рубля) |
| **ЛОТ 6** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | МАЗ 9919 00, гос. номер А 3538 А-4, 2008 г.в. (полуприцеп специальный цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м куб., цвет – оранжевый, разрешенная масса – 36 000 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 15 296,11 р. (пятнадцать тысяч двести девяносто шесть рублей одиннадцать копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 530 р. (одна тысяча пятьсот тридцать рублей) |
| **ЛОТ 7** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | МАЗ 437130 332, гос. номер АВ 1762-4, 2008 г.в. (автомобиль грузовой бортовой тентовый, цвет зеленый, грузоподъемность – 5 т., разрешенная масса – 10 100 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 7 014,05 р. (семь тысяч четырнадцать рублей пять копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 701 р. (семьсот один рубль) |
| **ЛОТ 8** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | MAZ 544019 421-031, гос. номер AI 8347-4, 2008 г.в. (грузовой двухосный седельный тягач, цвет – зеленый, разрешенная масса – 18 750 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 15 449,11 р. (пятнадцать тысяч четыреста сорок девять рублей одиннадцать копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 545 р. (одна тысяча пятьсот сорок пять рублей) |
| **ЛОТ 9** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | МАЗ 533702 240 АЦ10, гос. номер СН 9474, 2005 г.в. (автоцистерна 10 м куб. для перевозки нефтепродуктов на шасси двухосного автомобиля, цвет – белый, разрешенная масса – 16 000 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 8 087,93 р. (восемь тысяч восемьдесят семь рублей девяносто три копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 809 р. (восемьсот девять рублей) |
| **ЛОТ 10** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | МАЗ 437130, гос. номер АВ 6180-4 (автомобиль грузовой бортовой тентовый, цвет – зеленый, грузоподъемность – 5 т, разрешенная масса – 10100 кг) |
| **Начальная цена продажи** | 9 726,01 р. (девять тысяч семьсот двадцать шесть рублей одна копейка) |
| **Сумма задатка** | 973 р. (девятьсот семьдесят три рубля) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | РУП «Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт», 230005, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96, тел.: 45-27-03, 41-24-81 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5% от конечной цены продажи объекта;<br>- 100% предоплата за приобретаемый объект |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 23 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 19 июня 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

*http://grodnoino.by/*

## ООО «РАСАНТЕХТОРГ»

**(организатор аукциона) проводит 23.06.2017 г. торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества ООО «Верситы» (продавец)**

| Лот № | 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|---|
| **Сведения о предмете электронных торгов** | Основные средства, материалы | Товар ( электротехническая продукция) | Автомобиль легковой универсал Мазда СХ 5, 2013 г.в. | Автомобиль легковой седан Тойота Королла, 2013 г.в. |
| **Начальная цена предмета торгов (BYN)** | 28 701 руб. 82 коп., с НДС | 377 497 руб. 24 коп., с НДС | 26 400 руб.00 коп., с НДС | 17 760 руб. 00 коп., с НДС |
| **Шаг аукциона (BYN)** | 5% – 1 435 руб. 09 коп. | 5% – 18 874 руб. 86 коп. | 5% – 1 320 руб. 00 коп. | 5% – 888 руб. 00 коп. |
| **Сумма задатка (BYN)** | 10% – 2 870 руб. 18 коп. | 10% – 37 749 руб. 72 коп. | 10% – 2 640 руб. 00 коп. | 10% – 1 776 руб. 00 коп. |
| **Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с организацией торгов (BYN)** | 70 руб. 00 коп. | 100 руб. 00 коп. | 70 руб. 00 коп. | 70 руб. 00 коп. |
| **Местонахождение предмета торгов** | г. Минск, ул. Туполева, 20 | Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, 38 | г. Минск, ул. Туполева, 20 | г. Минск, ул. Туполева, 20 |
| **Р/с для перечисления суммы задатка** | №3012089360001 в ЗАО «БСБ Банк», код 175, УНП 191514793, получатель – ООО «Расантехторг» | | | |

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги) будут проведены 23.06.2017 г. в 9.00, на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание – 23.06.2017 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел.: (8 029) 6703084, (8-029) 9826474 , WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лотам: продавец ООО «Версити», в лице управляющего по банкротству Савича Егора Николаевича, тел. (8-029) 3309267.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг», – WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10% по каждому лоту принимаются по 20.06.2017 г.

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# ЗАМАК У БЯСПЕЦЫ



**Як той казаў, у страха вочы вялікія. Зусім нядаўна грамадскасць занепакоена абмяркоўвала сітуацыю на Навагрудскім замку. Маўляў, замак пад пагрозай, можа ў любы час упасці. Гучала досыць непрыемнае слова «разлом». На фотаздымках фігуравала трэшчына ў зямлі. Аднак калі гэтымі днямі я прыехала ў Навагрудак і пачала шпацыраваць па замкавай гары і вакол яе, то асаблівых жахаў там не пабачыла. Схілы ўжо параслі веснавой травой. Таму трэшчыну ў зямлі адшукала хутчэй дзякуючы мясцовым жыхарам. Ці ёсць моцныя нагоды для занепакоенасці, у якім стане насамрэч сёння замак, што плануецца рабіць, каб умацаваць земляныя схілы, карэспандэнту «Звязды» расказала загадчык сектара культуры аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама Наталля ЖЫШКО.**

## Складаны пры любой раскладцы

— Аб'ект, якому ўжо пад тысячу гадоў, пры любой раскладцы з'яўляецца складаным. Нават калі б там не было разлому, — мяркуе Наталля Жышко. — Яго будавалі з XIV па XVI стагоддзе. А руйнавалі ўсе ворагі, якія праходзілі праз Навагрудчыну. Бо яны найперш імкнуліся знішчыць абарончае ўмацаванне. Пачынаючы з войнаў сярэдзіны XVII стагоддзя, мы гаворым пра перыяд заняпаду замка. У іншыя часы людзі бралі адтуль цэглу, камяні, каб будаваць штосьці на сваіх сялібах, звозілі туды ўсякі бруд... Таму, калі сёння, бываючы на замку, чую, што з-за разлому ён знікне, мне робіцца не па сабе. Бо гэта надзвычай складаны помнік для ўсіх, хто на ім працуе. Нельга адназначна меркаваць пра руіны.

Мала хто ведае, што ў пачатку XX стагоддзя тут адбываліся абрушэнні сцен. Першы абвал часткі вежы Шчытоўка быў у 1906 годзе. У 1914-м пацярпела Касцельная вежа.

— У 1921 годзе, калі Навагрудчына ўвайшла ў склад Заходняй Беларусі і было створана Навагрудскае ваяводства, тагачаснае кіраўніцтва нарэшце зразумела, што замак — гэта каштоўнасць і з ім трэба нешта рабіць, — адзначае Наталля Жышко. — Таму першымі, хто распачаў аднаўленне замка, былі палякі. Яны пачалі работы ў 20-х гадах XX стагоддзя.

Польскія спецыялісты ўмацавалі сцены каменнымі падпоркамі. І паспрабавалі такім чынам захаваць тое, што было. З 1924 года там працаваў польскі археолаг Ромер.

## Міндоўга ўсё-такі каранавалі тут!

На доўгі час пра замак забыліся. Даследчыкі скіравалі сваю ўвагу на яго толькі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны.

— У 1970-х гадах пачынаюцца вельмі сур'ёзныя даследаванні Навагрудскага замка, — працягвае расказваць спецыяліст. — Археолагі знайшлі там чашу Ядвігі, якая цяпер экспануецца ў Эрмітажы і з'яўляецца яскравым доказам таго, што Міндоўг каранаваўся менавіта на Навагрудчыне. Бо чаша Ядвігі ў Сярэднявечча давалася тым кіраўнікам па ўсёй Еўропе, якія каранаваліся. Гэта знаходка прымушае замаўчаць усіх, хто спрабаваў казаць, што Міндоўг каранаваўся не ў Навагрудку.

Выяву чашы можна знайсці ў інтэрнэце.

## Праектныя рашэнні

У свой час сур'ёзныя даследаванні на замку праводзіў Міхась Ткачоў, аднак ён не займаўся аднаўленнем.

— У 1990-х гадах была створана беларуска-польская фірма «Рэнаватум». Яе спецыялісты заўважылі, што грунт вакол замка застаецца ўсё меней. Яны пачалі падсыпаць зямлю вакол Касцельнай вежы, бо схілы ўжо ў той час былі «голыя». І было вядома, што пад Навагрудскім замкам ёсць вада. У час абароны замка ў Сярэднявеччы гэта вельмі дапамагала тым, хто знаходзіўся ўнутры збудавання. Але вось у наш час стала праблемай.

Перад пачаткам праграмы «Замкі Беларусі» былі праведзены даследаванні, у тым ліку вывучэнне грунтоў. Пад замкам было знойдзена шмат вады і крыніцы, якія вымываюць грунты. Менавіта з-за іх утвараюцца разломы ў зямлі.

— У 2013 годзе апаўзанне грунтоў было зусім з іншага боку, не з боку Касцельнай вежы. Невялікі кавалак зямлі проста аб'ехаў. А ў канцы мінулага года каля веж я заўважыла невялікія разломы грунту — метра паўтара-два. Тады ж прадоўжыліся даследаванні. Іх вынікам стаў праект арганізацыі «Гроднаграмадзянпраект» па ўмацаванні схілаў Навагрудскага замка.

Акурат у мінулы панядзелак праект зацвердзілі ў Міністэрстве культуры Беларусі. Цяпер ён праходзіць экспертызу ва ўстановах, якія займаюцца грунтамі, землянымі работамі. Як толькі скончыцца экспертыза, пачнуцца работы па ўмацаванні грунтоў Навагрудскага замка.

— Варта падкрэсліць, што апоўзняў там няма. Ёсць толькі разломы. Іншымі словамі, нешта яшчэ трымае гэтую зямлю. А спецыялісты, якія прыязджалі да нас пачынаючы з лістапада, кажуць пра тое, што апаўзла менавіта тая зямля, якая была падсыпана ў 1996—1998 гадах. Для таго каб яна больш не трэскалася, у праекце прадугледжана ўстаноўка дрэнажнай сістэмы. Такім чынам, сем крыніц, якія ёсць па перыметры, будуць адведзены — вада пойдзе ў іншы бок. Зверху зробяць металічныя асновы, якія будуць трымаць зямлю.

Вопыт такіх работ у Гроднаграмадзянпраекта ёсць. Спецыялісты менавіта гэтай арганізацыі ўмацоўвалі зямлю каля Каложскай царквы ў Гродне, якая стаіць на беразе Нёмана. Фінансаванне на правядзенне работ у Навагрудку ўжо ёсць — сродкі выдзяляюцца з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў.

* * *

Не вельмі прыемна тое, што сітуацыю на Навагрудскім замку вельмі драматызавала грамадскасць. Пайшла пагалоска, што замак упаў! На навагрудскіх спецыялістаў абрынуўся шквал званкоў не толькі ад прадстаўнікоў беларускіх газет і парталаў. Званілі нават з Масквы, Кракава, Вільні — запытваліся, як тут, маўляў, збіраюцца аднаўляць руіны Навагрудскага замка, якія ўпалі? Аднак замак жа стаіць на сваім месцы. І будзе зроблена ўсё магчымае, каб працягнуў стаяць.

Варта прыгадаць і каменны «паясок», зроблены не так даўно на Касцельнай вежы, дзякуючы праграме «Замкі Беларусі». Многія таксама абураліся, што не надта аўтэнтычна на выглядае. Аднак менавіта гэты «паясок» захаваў Касцельную вежу ад магчымага абрушэння.

— Прыйдуць такія нашы нашчадкі, у іх будуць іншыя тэхналогіі, магчымасці, — узрушана разважае Наталля Жышко. — Але галоўнае, што мы захавалі для іх вежу. Не было мэты аднавіць замак. Але была зроблена «трывалая руіна». Часам гучыць крытыка, аднак у нас усё ціха толькі тады, калі ўвогуле нічога не робіцца. А найбольш дастаецца тым, хто бярэ на сябе адказнасць, як, напрыклад, ужо нябожчык Сяргей Друшчыц...

З сакавіка 2010 года працуе Дабрачынны фонд «Навагрудскі замак». З таго часу было сабрана 6058 рублёў і 213 еўра ахвяраванняў. Таму калі ёсць шчырая занепакоенасць і жаданне падтрымаць замак, то лепш зрабіць гэта на справе.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*г. Навагрудак*

■ Практычнае радзімазнаўства

# ВЯЛІКІЯ АГНІ

## Як на станцыі апынулася скульптура «Рабочага і калгасніцы»

**«Асцярожна, дзверы зачыняюцца. Наступны прыпынак — Негарэлае». Мінае некалькі хвалін — і перад вачыма паўстае аграгарадок Дзяржынскага раёна. У яго павольным ладзе жыцця цяжка заўважыць населены пункт, у якім 80 гадоў таму дзіўнымі хваламі віравала жыццё, а чыгуначная станцыя была шырока вядомая ва ўсім свеце. Паспрабуем адматаць стужку часу, ажывіць пажоўклыя старонкі архіўных спраў і зазірнуць у тое Негарэлае.**

## НАСЫЧАНАЕ МІНУЛАЕ

27 снежня 1935 года аташэ японскага пасольства Каанэн Кацумі, прагінаючыся пад цяжарам двух велізарных чамаданаў, сеў у цягнік Масква — Берлін. У гэты ж час пад Мінскам зазвінеў тэлефон: начальнік КПП «Негарэлае» Пётр Босы атрымаў даволі дзіўную тэлефанаграму з Масквы. Існавала імавернасць, што праз мяжу праследуе японскі дыпламат, які паспрабуе вывезці ў багажы двух жанчын. Быў атрыманы загад аб недапушчэнні вывазу. Падобныя асобы валодалі высокай ступенню недатыкальнасці і атрымлівалі шэраг ільгот паводле нормаў міжнароднага права, замацаваных у Гаванскай канвенцыі аб дыпламатычных служачых 1928 года. Дыпламатычныя рэчы падпадалі пад мытны нагляд толькі пры наяўнасці бясспрэчных і вельмі важкіх прычын. Выяўленне ў атшуканым багажы толькі дазволеных да правозу прадметаў цягнула вялікую адказнасць і непрыемнасці. Такія ж наступствы абяцаў і вываз шпіёнаў за мяжу.

Па загадзе начальніка КПП Пятра Босага мытнікі ўсяляк зацягвалі працэс афармлення дакументаў і правядзення мытных фармальнасцяў. Пры аглядзе чамаданы варочалі, «неспадзявана» кідалі на падлогу, незаўважна праколвалі шылам. У выніку нелегалкі не вытрымалі доўгай адсутнасці свежага паветра і свайго цяжкага становішча ды выявілі сябе самі. Аперацыя была бліскуча выканана.

А вось яшчэ адзін выпадак, які прыгадвае савецкі дыпламат Іван Майскі: *«Калі вярталіся з паездкі ў Лондан, нам расказалі, што днямі на станцыі Негарэлае пры перасадцы з вагона заходнееўрапейскай каляіны ў наш вагон, насільшчык, што нёс багаж польскіх дыпкур'ераў у мытную залу, выпадкова выпусціў на бетонную падлогу іх драўляную скрыню. Скрыня разбілася, і з яе пасыпаліся... жаночыя панчохі, цюбікі губной памады, пудра, парфума. У зале знаходзіўся начальнік пагранічнай аховы, і яму нічога не заставалася, як сказаць польскаму дыпкур'еру: «Ай-яй-яй, як усё гэта непрыемна... Паверце, я б хацеў пазбегнуць галоснасці, але прыйдзецца скласці акт». Акт быў складзены з пералікам усяго, што было ў пабітай скрыні...»*.

## АД ВЯРБЛЮДАЎ ДА ФАРМАЛЬДЭГІДУ

Звернем увагу і на легальны бок — вялікую колькасць самых разнастайных тавараў, што праходзілі праз станцыю. Чытаем зварот Абрама Яўгенавіча Магідсона, кіраўніка Саюзпушніны, ад 7 студзеня 1937 г.: *«Мытнай станцыі Негарэлае. Просім не чыніць перашкод вывазу 6 галоў вярблюдаў, што накіроўваюцца ў Германію і належаць спадару Эймэнэ, з якім мы маем дамоўленасць. Перадача вярблюдаў даручаецца таварышу Скобелеву, якому выдадзена даверанасць»*.

На вочы трапляецца зварот нямецкага консульства ў Новасібірску па дапамогу негарэлаўскіх мытнікаў у пошуку грузу (малярнага клею і фарбы для рамонту будынка консульства), што згубіўся між Негарэлым і Новасібірскам. Ці былі адшуканыя гаротныя матэрыялы — застаецца загадкай. А вось справаздача мытні за 27 мая 1936 г.: *«Польскі кур'ерскі цягнік даставіў астранамічныя інструменты французскай экспедыцыі. Лідар экспедыцыі — грамадзянін Дзюфен. Каб пазбегнуць магчымай затрымкі прадметаў, аформлена адпраўка дадзенага грузу без накладання мытных пломбаў, што паказана ў правазных дакументах, такім чынам чыгунцы былі дадзены ўсе магчымасці для адпраўкі са станцыі Негарэлае кур'ерскага цягніка 27 мая гэтага года. Аднак 27 мая гэты груз адпраўлены не быў, хоць чыгунка і мела дастаткова часу для здзяйснення гэтай аперацыі. Намеснік кіраўніка Негарэлаўскай мытні Фёдараў»*.



**Негарэлаўская станцыя, знішчаная падчас Вялікай Айчыннай вайны. Фотаздымак 1930-х гадоў.**

Атрутны эфект фармаліну і фармальдэгіду вядомы ўсім. Быў час, калі такія рэчывы прапускаліся праз мяжу абсалютна бяспошлінна, аб чым і сведчыць наступнае пісьмо на адрас Негарэлаўскай мытні ад 16 чэрвеня 1926 г.: *«Галоўнае мытнае ўпраўленне паведамляе для выканання, што пастановамі Мытна-тарыфнага камітэта ад 25 мая і 15 чэрвеня фармалін (водны раствор фармальдэгіду) выключаны са спісу прэпаратаў для барацьбы са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы, якія прапускаліся бясплатна. Начальнік ГМУ Пацяеў»*.

Негарэлаўская станцыя магла пахваліцца і прадме-

■ Фестывалім

# На вяселле да Ягайлы



## Прайшоў VIII фэст сярэднявечнай культуры «Гальшанскі замак»

**Сёлета ён быў прысвечаны 595-годдзю вяселля караля польскага Ягайлы і Соф'і Гальшанскай, якая стала пачынальніцай каралеўскай дынастыі Ягелонаў.**





Кожны фэст, які не ўпершыню праходзіць у нашай краіне, мае свой адметны твар. Фестываль у аграгарадку Гальшаны, што на Ашмяншчыне, хоць і валодае статусам рэгіянальнага, ужо каторы год аб'ядноўвае аматараў айчыннай гісторыі з усёй краіны. І справа не толькі ў тым, што ён па традыцыі распачынае фестывальны сезон, але і ў незвычайнай атмасферы, што пануе на пляцоўках каля муроў старажытнага замка Сапегаў. Здаецца, час пачынае ісці ў адваротны бок і палац магнатаў зноў жыве звыклым жыццём: у яго залах ладзяцца балі, каля сцен — прадстаўленні вандроўных тэатраў, турніры рыцараў і бугурты.

**Міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ,** адкрываючы фестываль, зазначыў:

— Гэты фэст, які ладзіцца каля муроў старажытнага Гальшанскага замка, з кожным годам выклікае ўсё больш цікавасці не толькі ў жыхароў Ашмяншчыны. Кола яго прыхільнікаў сярод усіх жыхароў нашай краіны нязменна пашыраецца. Фэст займае адметнае месца, а тое, што ён акцэнтуе ўвагу на мінуўшчыне краю, — паказчык пашаны мясцовых улад да гісторыі. Тут робяць усё магчымае, каб захаваць нашы здабыткі, нашу культурную, духоўную спадчыну для наступных пакаленняў. Мы ведаем найноўшую гісторыю Гальшанскага замка, памятаем, у якім жудасным стане знаходзілася яго тэрыторыя яшчэ некалькі гадоў таму. Спадзяюся, што ў самы бліжэйшы час дзякуючы падтрымцы інвестараў мы пабачым замак, адроджаны з руінаў.

Дарэчы, зрабіць ахвяраванне на аднаўленне замка, дадаць сімвалічную цаглінку да яго макета мог літаральна кожны наведвальнік фестывалю. Гэта стала своеасаблівым падарункам на вяселле Соф'і Гальшанскай і караля Ягайлы, бо ўсе ўдзельнікі і госці фэсту па праву маглі сябе назваць гасцямі на гэтым вялікім балі. Сімвалічна, што свята распачалося святочнай літургіяй у гонар Соф'і Гальшанскай, ганаровыя госці ўсклалі кветкі да помніка Соф'і, а потым усе разам далучыліся да вясельнага картэжу — тэатралізаванага мастацка-гістарычнага шэсця да асноўнай пляцоўкі свята. Сёлета ў ліку ўдзельнікаў фэсту былі сябры клубаў гістарычнай рэканструкцыі з Гродна, Мінска, Ліды, Вілейкі, Ляхавіч, Ваўкавыска, Маладзечна, яркае інтэрактыўнае прадстаўленне «Юр'я і Цмок» падрыхтаваў вандроўны тэатр «Вір» з Мінска, а танцавальны калектыў Soleil правёў майстар-клас па сярэднявечных танцах.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Адной з найярчэйшых старонак фэстывалю можна назваць конны турнір, вядучым якога ўжо традыцыйна выступіў кіраўнік клуба «Залатая шпора» Павел Заслаўскі. Падчас спаборніцтва коннікі мусілі паказаць спрыт, хуткасць і трапнасць у нанізванні «пярсцёнка» на дзіду, рассяканні мячом капусты і яблыка, падняцці хусткі з зямлі дзідай. Удзельнікі турніру даказалі, што спрытным конным ваяром можна быць у любым узросце: найстарэйшым коннікам быў 67-гадовы пан Олесь.

Які ж фэст без канцэрта ды танцаў? Сёлета за забавы адказвалі гурты «Восьмыдзень» з Віцебска, Cad Goddeu з Брэста, HardWood і «Стары Ольса» з Мінска. Завяршылася свята позна ноччу яскравым штурмам крэпасці і феерверкам.

У час, калі фестывалі сярэднявечнай культуры ператвараюцца ў камерцыйныя імпрэзы, «Гальшанскі замак» застаецца ўсё такім жа душэўным і па-свойску ўтульным. Важна, што акцэнт нязменна робіцца на гістарычнай мінуўшчыне краю (а тут сапраўды ёсць чым пахваліцца), істотнасці захавання старажытных замкавых муроў.

Фэст у Гальшанах распачаў сезон, і ўжо 27 мая гасцей запрашае музей народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо непадалёк ад сталіцы. Тут пройдзе фестываль «Эпоха рыцарства».

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

---

# НЕГАРЭЛАГА

тамі мастацтва, перавозка якіх заўсёды выклікала шмат пытанняў: *«У ГМУ. 27 мая 1932 г. Негарэлаўская мытня паведамляе, што пры выездзе за мяжу амерыканскага грамадзяніна В. Друкера, у яго пашпарце значыліся зарэгістраваныя пры ўездзе ў СССР чатыры фота-кіназдымачныя апараты і адна труба фірмы Бах, якая падлягае зваротнаму вывазу за мяжу. У сапраўднасці ім вывезены толькі фота-кіназдымачны апарат, а труба, па яго заяве, падораная артысту Маскоўскай дзяржаўнай акадэміі Вялікага тэатра Міхаілу Табакову (заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, лічыцца адным з заснавальнікаў сучаснай расійскай школы выканання на гэтым інструменце. —* **Аўт.***), у пацвярджэнне чаго ім прадстаўлена даведка ДАВТ №2305 за 1932 г. Кіраўнік мытні Бабаян».* Мастацтвазнавец С. Ратгаўз успамінаў: *«Першая мая сустрэча са скульптурай «Рабочы і калгасніца» адбылася не ў Маскве, а ў Беларусі, на станцыі Негарэлае. Гэта было ў канцы сакавіка 1937 г. Нехта паказаў на вялізны груз, які займаў адзін з чыгуначных шляхоў: «Скульптуру вязуць у Парыж на выстаўку». Я здзівіўся: «Такую вялікую?» Для яе быў пададзены цягнік, які складаўся з 26 платформаў. Разам з асноўным каркасам груз важыў каля 75 тон. Асобныя дэталі займалі цэлыя платформы. <...> Група савецкіх і французскіх спецыялістаў — інжынеры, зваршчыкі, мантажнікі — сабрала і ўсталявала скульптуру ў савецкім павільёне за 11 дзён. А праз некаторы час пасля закрыцця выстаўкі ўжо шырока вядомая свету кампазіцыя «Рабочы і калгасніца» такім жа шляхам перасякла мяжу ў Негарэлым у зваротным напрамку».*



**Агульны выгляд рэвізійнай залы станцыі Негарэлае.**
**Фота І. Салавейчыка ў часопісе «Чырвоная Беларусь», 1932 год.**

## БУДНІ НА МЫТНІ

Негарэлаўская мытня знаходзілася за 11 вёрстаў ад мяжы з тагачаснай Польшчай, мела 2 мытныя пасты на ст. Коласава і ў мястэчку Магільна. Апошні дзейнічаў падчас сплаву лесу за мяжу па рацэ Нёман. Яе дзейнасць прыпала на росквіт сацыялістычных спаборніцтваў, якія часам мелі і адмоўны ўплыў на дзейнасць працоўных калектываў. Чаго варта наступнае пісьмо «даведачнага характару», накіраванае ў Негарэлае 11 студзеня 1938 г.: *«Загад кіруючага характару. Матэрыялы сацспаборніцтваў за 1937 г. паказваюць, што ў шматлікіх выпадках гэтая выдатная форма камуністычных адносін да працы апошлена. Ворагі народа прыклалі да гэтага сваю руку. Так, для выканання пункта «Барацьба за захаванасць форменнага абмундзіравання» ў Мікалаеўскай мытні перасталі залазіць у трумы. Паказчык «скарачэнне тэрміну надгляду судоў» прывёў да таго, што кантралёр ленінградскай мытні надглядаў у месяц 38 722 месцы на параходах (атрымоўваем: у дзень — 1551 месца, у гадзіну — 259 месцаў)».* Для параўнання, інфармацыі пра ўхіленне негарэлаўскіх мытнікаў ад надгляду цягнікоў знойдзена не было.

У 1936 годзе адбыўся невялікі канфлікт паміж мытняй і памежным кантрольна-прапускным пунктам у Негарэлым: была затрымана кантрабанда ў грамадзяніна Ірана Ісвагані Гусейна на суму 560 савецкіх рублёў і 15 англійскіх фунтаў стэрлінгаў. Кантрольна-прапускны пункт 16-га памежнага атрада НКУС СССР паведамляў: *«У вашых звестках (маецца на ўвазе справаздача Негарэлаўскай мытні. —* **Аўт.***) гэта затрыманне значыцца як самастойнае затрыманне мытні, у той час як затрыманне кантрабанды выключна праведзена па ініцыятыве КПП, нашым кантралёрам Дабрыніным».* У адказ кіраўніцтва Негарэлаўскай мытні пісала памежнікам: *«Нават сумесным гэта затрыманне лічыць немагчыма, яно цалкам належыць нашаму кантралёру Краўчуку, які, у сваю чаргу, проста расказаў Дабрыніну аб незвычайным чамадане іранца».* Спрэчную справу разглядала Галоўнае мытнае ўпраўленне і стала на бок мытнікаў. Падобныя непаразуменні часам узнікалі і з мясцовай чыгункай. У пратаколе №1 *«Тэхнічнай нарады супрацоўнікаў Негарэлаўскай мытні» ад 2 лютага 1932 г. адзначалася, што «вагоны загружаюцца чыгуначнікамі без ведама мытні, а толькі па дамоўленасці з Саюзтрансам. Як вынік, дзяжурны інспектар мытні цалкам пазбаўлены магчымасці зрабіць праверку грузаў, што загружаюцца ў зборныя вагоны». Барацьбу з нелегальным правозам рэчаў ускладняў і той факт, што рэвізійная зала мытні вельмі слаба асвятлялася і была «не выключана магчымасць пасажыра ўцячы з багажом ад мытнага надгляду».*

Памежныя раёны заўсёды былі своеасаблівымі. Мяжа, што падзяліла беларускія землі ў 1921 годзе, прынесла росквіт кантрабандзе і бандытызму ў памежных раёнах. Аб'ём кантрабанды і колькасць людзей, якія ёй займаліся, былі большыя, чым калі-небудзь у беларускай гісторыі. Важнай старонкай гэтага перыяду з'яўляецца і станцыя Негарэлае, дзейнасць якой хавае яшчэ шмат цікавага і невядомага.

...Ішоў 1928 год. Пасля візіту ў Германію і Францыю Уладзімір Маякоўскі ў вершы «Они и мы» пісаў:

*На горизонте — белое.*
*Снега и Негорелое...*

**Канстанцін НАШЧЫНЕЦ.**
*mytnaya.supolka@gmail.com*

## Извещение об аукционе 23 июня 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Капитальное строение с инв. №130/С-46621 «Здание проходной с навесом и покрытием» | Капитальное строение с инв. №130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями) | Капитальное строение с инв. №130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий» |
|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11А | г. Пинск, ул. Калиновского, 11П | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У |
| Тип помещения | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее | Отдельно стоящее |
| Общая площадь (кв. м) | 81,0 | 539,0 | 1930,1 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 0,0527 | 0,1827 | 0,3941 |
| Начальная цена продажи, рублей | 26 955,18 | 67 418,89 | 2 389 090,90 |
| Сумма задатка, рублей | 2 695,52 | 6 741,89 | 238 909,09 |
| Затраты на оценку, организацию и проведение аукциона, рублей | 1585,04 | | 1498,71 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Сведения об объекте | Одноэтажное. Состоит: здание проходной 81 $м^2$, навес 35 $м^2$. Покрытие асфальтобетонное 234 $м^2$. Отопление: печь, котел на твердом топливе. Ввод в эксплуатацию – 1979 г. | Одноэтажное здание. Канализационная сеть 73 м, водопроводная сеть 20,4 м, бетонное покрытие 701 $м^2$. Ввод в эксплуатацию – 1992 г. | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 $м^2$, помещение ремонтно-механического участка 294 $м^2$, помещение цеха доборных изделий 1456 $м^2$, пристройка 12 $м^2$, навес 24 $м^2$, градирня 33 $м^2$, два теневых навеса 7 $м^2$. Покрытие бетонное 1030 $м^2$. Ввод в эксплуатацию – 1970 г. |
| Организатор аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | |
| Продавец аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | | |

Аукцион состоится **23 июня 2017 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале.
Перечень необходимых документов:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление, код 401, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 22 июня 2017 г. включительно.
3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;
4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов;
5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.
Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.
Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 09.00 до 15.00 по рабочим дням по 22 июня 2017 года включительно, тел. 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон 375-29-640-80-37**

## Извещение о проведении 6 июня 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
